

*У Карпатах* ☞ 3

# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

*АЛЯКСАНДРА БЕРГМАН* ☞ 9



http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 34 (2571) Год L | Беласток, 21 жніўня 2005 г. | Цана 2,00 зл.

*В. Цімашэвіч: Памылкай з боку кожнай арганізацыі беларускай меншасці ў Польшчы было тое, што не прынялі адназначнай пазіцыі наконт эксцэсаў у адносінах да Саюза палякаў Беларусі...*

# Не разумею Лукашэнкі

**Размова з Уладзімежам ЦІМАШЭВІЧАМ, маршалкам Сейма, кандыдатам у прэзідэнты РП.**

***— У сённяшняй канфліктнай сітуацыі Вы выказаліся за распачацце польска-беларускага дыялога. У чым ён меў бы заключацца і хто меў бы весці гэты дыялог?***

— Міністэрства замежных спраў Беларусі сігналізавала гатоўнасць да такіх размоў. Я лічыў і лічу далей, што трэба верыфікаваць гэту дэкларацыю, праверыць, ці яна сапраўдная, а не толькі чыясьці выдумка. Неабходна запытацца, чаго мелі б датычыць тыя размовы. З нашага пункту гледжання ёсць менавіта пэўныя справы, у якіх цяжка ісці на кампраміс. Напрыклад, калі разумець правы Саюза палякаў Беларусі. Гэта ж незалежная няўрадавая арганізацыя, у якую ніякія ўлады, у тым ліку і Міністэрства юстыцыі, не павінны ўмешвацца. Калі гучыць адказ: „У нас, у Беларусі, такі закон”, гэта значыць, што той закон недэмакратычны. У дэмакратычнай дзяржаве шануецца аўтаномія няўрадавых арганізацый. Гэта сама арганізацыя мае права вырашаць аб тым, хто мае быць яе старшынёй. Наконт тае дэкларацыі аб дыялогу трэба было б праверыць, што беларускі бок мае на думцы. Значыць, знешнепалітычныя ведамствы павінны весці размовы на нізкім узроўні. Для гэтага могуць быць вызначаны саветнікі пасольстваў альбо спецыяльна ўпаўнаважаныя пасланцы; гісторыя дыпламатыі ведае такія выпадкі. Незалежна ад таго, ці будзем размаўляць з беларусамі, трэба ўздымаць такія пытанні — як гэта ўжо польскае МЗС рабіла — на форумах міжнародных арганізацый: Савета Еўропы, Еўрасаюза. Трэба звяртацца ў Арганізацыю па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе і ў Камісію па правах чалавека ААН. Асабліва АБСЕ мае ў распараджэнні спецыяльны род місій, якія дзейнічаюць у выпадках такога тыпу.

***— Аднак, місіі АБСЕ ці прадстаўнікі Савета Еўропы бывалі ў Беларусі, ацэньвалі сітуацыю, прымалі рэзалюцыі і нічога з гэтага не вынікала?***

— Трэба прабаваць, хоць я не разумею матываў, якімі кіруецца Аляксандр Лукашэнка, асабліва ў сённяшняй сітуацыі. Польшча, пры ўсім крытыцызме да яго палітыкі і палітычнай сітуацыі ў Беларусі, старалася, аднак, быць суседам прыязна пастаўленым да гэтай краіны і народа. У даны момант улады Беларусі робяць усё, каб зneахвоціць да такой пазіцыі, схіліць нас да таго, каб мы адвярнуліся ад Беларусі. Справа тут не толькі ў непасрэдных палітычных дзеяннях у адносінах да Саюза палякаў Беларусі, але таксама ў афіцыйнай прапагандзе, якая вядзецца ў кантраляваных дзяржавай СМІ, што толькі сведчыць аб імкненні палітычных улад Беларусі да пагаршэння стасункаў паміж нашымі дзяржавамі.





Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

***— Якая Ваша думка ў справе арганізавання ў Польшчы радыё, якое вяшчала б на Беларусь?***

— Апасаюся, што як сітуацыя палякаў у Беларусі, так і беларусаў, стараючыхся за дэмакратычныя правы, можа стаць мячом у выбарчай гульні ў Польшчы. Да тае справы генеральна я стаўлюся пазітыўна. Два гады пасля размовы з Янам Новакам-Езяранскім, я — як шэф МЗС — у перапісцы з Еўрапейскай камісіяй прапанаваў супольныя дзеянні ў гэтай справе, таксама пры ўдзеле пазнейшых новых членаў ЕС, сярод іх і Літвы. Гэта павінна быць еўрапейскае мерапрыемства, не толькі па прычыне коштаў, бо яны тут менш важныя. Справа ў тым, каб нікому ў Беларусі ці ў якой іншай дзяржаве ў галаву не прыйшло, што маем дачыненне з польска-беларускім супрацьстаяннем. Справа ў дэмакратычных стандартах, якія павінны безумоўна выконвацца ва ўсёй Еўропе. ЕС не мусіў бы гэтага рабіць у які-небудзь тайны спосаб, а гарантаваць права на доступ да сумленнай інфармацыі, дбаючы аднаchасова, каб радыёстанцыя (радыёстанцыі) не вылучаліся палітычнай прадузятасцю.

***— Як Вы ацэньваеце факт занясення ў выбарчыя спіскі ў парламент падляшскім СЛД старшыні БГКТ Яна Сычэўскага, вядомага з пралукашэнкаўскіх дзеянняў і выказванняў?***

— Я рашыўся не ўмешвацца ў выбарчую кампанію СЛД і ў гэтым я паслядоўны. Гэта датычыць таксама Падляшша. Калі стану прэзідэнтам, то займуся выключна справамі дзяржавы, а не нейкай палітычнай партыі. На маю думку, памылкай з боку кожнай арганізацыі беларускай меншасці ў Польшчы было тое, што не прынялі адназначнай пазіцыі наконт эксцэсаў, якія мелі месца ў адносінах да Саюза палякаў Беларусі. Было б гэта разумна і па-людску сумленна...

***— Даруйце, але асяроддзе згуртаванае вакол тыднёвіка „Ніва” і яе сябры выказалі сваю пазіцыю.***

— Я аб гэтым не ведаў. Мабыць, гэта пазіцыя не была адпаведна агучана. Я штодзень маю доступ да агульнапольскай прэсы. Калі БГКТ гэтага не зрабіла, дык мая ўвага датычыць гэтай арганізацыі.

**Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ**

## *Мяжа: няма лёгка* ☞ 2

Мікалай ВАЎРАНЮК

*Калі мытнікі доўга думалі як скласці пратакол на тыя касеты, да мяне падышоў малады хлапец у скуранай куртцы і з чорнымі акулярамі паднятымі заліхвацка на валасы ды прадставіўся як лейтэнант якойсьці спецслужбы і пачаў распытваць мяне пра цяжкасці жыцця ў Польшчы, пра забастоўкі і дэманстрацыі ў Варшаве, пры-ясненні беларусаў на Беласточчыне...*

## *З задняга месца* ☞ 2

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

*Калі кандыдат, за якога мы хвалюемся, прыедзе ў Беласток, — а прыязджаць яны будуць, — тады трэба ў яго папрасіць добрага ўчынку. Але не вадзіць нейкіх гарадскіх бабулек па небяспечнай вуліцы, але каб паехаў у каторую з нашых пусцеючых вёсак і тамашняй самотнай бабульцы загатовіў і нарубаў крыху дроў...*

## *У Бандарах* ☞ 4

Віктар БУРА

*Задорныя і бадзёрыя песні заахвочвалі публіку танцаваць і ўторыць спевакам. Раптам з лавачакі падняўся і пусціўся ў скокі няўрымслівы мужчына, выконваючы складаныя акрабатычныя фігуры. Ніхто не мог і падумаць, што гэтаму гнуткаму танцору ўжо за пяцьдзесят...*

## *Вяртанне імёнаў* ☞ 8

Віталь ЛУБА

*У зборніку знаходзім таксама беластоцкія сляды. У артыкуле „Халімон з-пад пушчы” аўтар піша пра Яўгена Хлябцэвіча, сына святара з Кленік, карэспандэнта „Нашай нівы”, крытыка і бібліятэказнаўцу, успамінае таксама Марыю Базылюк — даследчыцу яго-най творчасці, публіцыстыцы і літаратурнай крытыцы якога прысвяціла сваю магістэрскую працу...*



## *Царскі рэстаран* ☞ 11

Міхал МІНЦЭВІЧ

*Пасля звыш ста гадоў чыгуначнае спалучэнне з Белавежай (бывала, па сем паяздоў у суткі) было ліквідавана, а салідны будынак вакзала Белавежа-Таварная з году ў год руйнаваўся. Ад далейшага заняпаду выратавала вакзал прыватная ініцыятыва двух асоб і цяпер, з 16 лютага г.г., месціцца там фешэнебельны „Царскі рэстаран”...*

# Як я стаў героем



*Чацвер, 11 жніўня, быў страшны. Галава балела ад непраспанай ночы. Трэба было змантаваць цэлую тэлепраграму „Беларускі тыдзень” на бліжэйшую нядзелю. А тут пачасціліся званкі ад знаёмых і незнаёмых журналістаў, газет, радыё і тэлебачання з цэлае Польшчы. І ўсім расказвай тую самую гісторыю.*

*Было так. Паехалі мы ў Беларусь у панядзелак 8 жніўня на машыне ўтраіх: апаратар, вадзіцель і я. Вяртаўся я ў сераду вечарам адзін, бо калегі засталіся працаваць з журналісткай Тэлевізійнага інфармацыйнага агенцтва з Варшавы. Купіў я білет на цягнік, прайшоў мытны кантроль на гродзенскім вакзале і падаўся да памежнікаў. Афіцэру чамусьці мой пашпарт адразу не спадабаўся. Доўга яго разглядаў, а потым стаў з кімсьці кансультавацца. У той момант я ўжо стаяў за кантрольнай форткай — без пашпарта — у зале, дзе duty free крамы, калі падышлі да мяне тры ці чатыры памежнікі і вярнулі назад — у пакой, дзе праводзіцца асабісты кантроль. Там дакладна ашмоналі мой багаж. Зацікавілі іх чатыры відэакасеты і ўсе нататкі, у якіх хоць што-небудзь было пра Беларусь.*

*Памежнікі паклікалі мытнікаў і загадалі ім яшчэ раз дакладна перагледзець мае сумкі. Тыя гарталі мой блакнот старонку за старонкай. Забралі некалькі старых, агульна даступных прэсавых інфармацый, між іншым рэзалюцыю Еўрапарламента ў справе парушэння правоў чалавека ў Беларусі і паведамленне беларускага дзяржаўнага прэсавага агенцтва „БелТА” (sic!) аб планаваным круглым стале ў Гродне, прысвечаным мясцовым палякам. Мытнікі забралі чатыры відэакасеты. На трох былі старыя запісы з Беласточчыны, а на адной — размовы з дзеячамі Саюза палякаў на Беларусі і лідэрамі беларускай дэмакратычнай апазіцыі. Запісы былі зроблены перш-наперш для праграмы „Беларускі тыдзень”. Гродзенскія палякі гаварылі па-беларуску, што яшчэ ніколі не атрымалі столькі слоў падтрымкі ад беларусаў. Падкрэслівалі, што гэта не польска-беларуская вайна, а толькі рэпрэсіі рэжыму ў адносінах да сваіх грамадзян.*

*Калі мытнікі доўга думалі як скласці пратакол на тыя касеты, да мяне падышоў малады хлапец у скуранoй куртцы і з чорнымі акулярамі паднятымі заліхвацка на валасы ды прадставіўся як лейтэнант якойсьці спецслужбы (якой, я не дачуў) і пачаў распытваць мяне пра цяжкасці жыцця ў Польшчы, пра забастоўкі і дэманстрацыі ў Варшаве, прыцясненні беларусаў на Беласточчыне. Потым пацікавіўся, ці не было ў мяне непрыемнасцяў у Беларусі, калі я гаварыў па-польску. На маю заўвагу, што можа ён не зразумеў, але я з ім гавару па-беларуску, хлопец у скуранoй куртцы іранічна ўсміхнуўся: „У нас так гавораць толькі людзі з глыбінкі або палякі; адных і другіх могуць успрымаць не вельмі добра”. Агульна лейтэнант, як і ўсе іншыя функцыянеры, паводзіў сябе карэктна і нават развітаўся словамі: „Очень приятно было с вами познакомиться”. Я мог толькі адказаць: „Шкада, што не магу вам аддзячыць такімі ж словамі”.*

*Тым часам мытнікі запоўнілі квітанцыю, з якой пасля дзесяці дзён магу заявіцца ў гродзенскую мытню па мае касеты. Той час патрэбны ім на тое, каб прагледзець, ці няма на ёй якой крамолы. Беластоцкі асяродак Польскага тэлебачання працуе на нетыповай сістэме DVCPRO, дык я адчуў сваім абавязкам папярэдзіць мытнікаў, што ў іх будуць цяжкасці з праглядм касет. Яны мяне тут жа супакоілі: гэта не ваша праблема!*

*Ва ўсім гэтым здарэнні найбольш мне спадабалася тое, што цягнік чакаў мяне аднаго цэлую гадзіну. Перастала мне гэта падабацца, калі цягнік адпусцілі, а мяне яшчэ не. Была больш-менш дзевятая вечара. Наступны цягнік у Кузніцу адпраўляўся ў $4^{20}$ раніцы.*

*Апошнім часам я некалькі разоў перасякаў польска-беларускую мяжу. Кожны раз беларускія мытнікі доўга правяралі мой пашпарт, відаць, кансультуючыся з кімсьці важным, што са мною рабіць. Пакуль, маю важную візу і акрэдытацыю на выконванне журналісцкіх абавязкаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Але як можа тэлежурналіст працаваць, калі забіраюць яму на мяжы касеты. Паколькі я не адзіны журналіст з Польшчы, у якога ў апошні час былі праблемы з перасяканнем беларускай мяжы, у мяне складваецца ўражанне, што ўлады Рэспублікі Беларусь хочуць ізаляваць сваіх грамадзян ад вонкавага свету.*

*Шкада, бо сённяшняя Беларусь апрача добрых людзей, цікавых гарадоў і прыгожай прыроды, мае яшчэ адну станоўчую якасць. Вельмі лёгка стаць там героем сродкаў масавай інфармацыі. Найчасцей не па сваёй волі.*

**Мікола Ваўранюк**

# З задняга крэсла



*Нядаўна на супрацьлеглым Беласточчыне канцы нашай краіны ўспыхнуў скандал. У шпіталі лекар апісваў сваіх хворых крымінальнымі мянушкамі. За гэтакую гаючую практыку вышэйшыя медыцынскія ўлады выдварылі са шпіталя не толькі яго, але і ягонага бацьку, які быў шэфам свайго сына. Бацька з сынам заявілі, што абскардзяць рашэнне вышэйшага чынавенства, бо яно незаконнае.*

*Мабыць, з пункту гледжання кодэкса працы, сямейнікі маюць рацыю. І ўлады, яшчэ вышэйшыя за тыя медыцынскія, павінны да запіскаў маладога ўрача паставіцца з большай павагай. У справу, па-мойму, павінна ўмяшацца пракуратура і тым хворым, што апісаны спецыялістам крымінальнымі мянушкамі, паставіць адэкватныя абвінавачанні. Бо ў гэтай справе маецца прэцэдэнт, якога ніхто ў нашай краіне не ставіць пад сумненне.*

*Мова тут пра змест тых найслаўнейшых апісанняў адмысловых хвароб, у якія не так даўно мянушкі запісвалі дыягнасты і тэрапеўты колішняга ідэалагічнага лячэння. Сёння тыя высновы лічацца законнай падставай цяперашняй палітычнай праваты, бо на іх падставе выдаюцца сертыфікаты на публічную прысутнасць. Мяркую, што розніца паміж суб’ектыўнымі нататкамі і аб’ектыўнай рэальнасцю ў абодвух абстаноўках нявартая ўвагі. А пра іх якасць можна меркаваць на аснове якасці ўладальнікаў тых сертыфікатаў.*

*На маю асабістую ацэнку тыя ўсе сертыфікаты можна павесіць на цвік за клуняй; карысць ад гэтага будзе двайная. Але справы маюцца наадварот: згаданыя колішнія спецыялісты кіруюць сёння, праз пасрэдніцтва тых сваіх пісулькаў, нашым публічным жыццём з задніх крэслаў, дыстанцыйна. У згаданым выпадку з-за часовай дыстанцыі. Але ўмяшанне ў публічную сферу адбываецца і шляхам прасторавага дыстанцыйнага кіравання.*

*Вось у гонцы за польскае прэзідэнцкае крэсла вялікі рывок уперад зрабіў Дональд Туск, захапіўшы выразнае лідэрства. Цікава даведацца, чый гэта штуршок так рашуча яго падагнаў? Хіба не памылюся, калі выкажу здагадку, што да прэзідэнцкага Алімпа прыблізіў яго візіт у Беларусь, дзе ён спаткаўся з лідэрамі Саюза палякаў. Гэты добры ўчынак, гэтае спатканне паказала польскае тэлебачанне і патэнцыйны электарат з захапленнем пабачыў, што кандыдат рашуча падтрымлівае суродзічаў. Але...*

*Не ўсіх ахвотых паказацца ў патрыятычным іміджы беларускія ўлады ўпускаюць на сваю тэрыторыю, не кожнаму даюць шанс паказацца перад электаратам шчырым патрыётам. Як тая сарока-варона, што кашку варыла і аднаму дала, а другому не дала. Не кашку, але падтрымку электарата. Як відаць, Лукашэнка можа круціць выбарамі не толькі ў савецкай Беларусі, але і ў нашанькай Польшчы.*

*І тут я бачу шанс для нас, тутэйшых, каб станоўча адгукнуцца на заклік нашых найяснейшых братоў у дэмакратыі і гэтак жа станоўча супрацьдзеяць тыранскім махінацыям. Справа вось у чым: калісь пастаянны кандыдат у прэзідэнты Януш Корвін-Міке заўважыў, што калі б каторы з такіх спаборнікаў памог нейкай старэнькай бабульцы прайсці праз рухлівую гарадскую вуліцу, тады яго рэйтынг даў бы ці не рашучага дразда ўсім тым сарокам-варонам.*

*Калі кандыдат, за якога мы хвалюемся, прыедзе ў Беласток, — а прыязджаць яны будуць, — тады трэба ў яго папрасіць добрага ўчынку. Але не вадзіць нейкіх гарадскіх бабулек па небяспечнай вуліцы, але каб паехаў у каторую з нашых пусцеючых вёсак і тамашняй самотнай бабульцы загатовіў і нарубаў крыху дроў. Думаю, што тэлебачанне, якое скрупулёзна сочыць за кожным рухам ахвотных ва ўладныя харомы, не адмовіцца паказаць добрага ўчынку прагнаму дабра электарату.*

*Карысць ад гэтага магла б быць двайная. Можа такі хвацкі кандыдат заваладаў бы душамі выбаршчыкаў, калі заміж праліваць кракадзілавы слёзы, на справе даказаў бы сваю ўсхваляванасць доляй нямоглых людзей. А мы тут выканалі б заказ нашых яснейшых братоў і паказалі б Лукашэнку — як гаварыў калісь Хрушчоў — кузькіну маць! Звялі б у нішто яго маніпуляцыі з задняга крэсла польскімі справамі!*

*Невядома толькі, як да гэтага паставіліся б палітычныя спаборнікі. Бо навошта змагацца з няколкімі сукамі, калі гладкае прымяненне крымінальнай тэрміналогіі ў пытаннях нацыянальнага лячэння дае двухбаковыя шчодрыя палітычныя балы?*

**Аляксандр Вярбіцкі**

# Місія чатырох (+1)



*Чатырох польскіх еўрадэпутатаў з Грамадзянскай платформы (PO): Барбара Кудрыцкая, Багуслаў Сонік, Багдан Кліх ды віцэ-старшыня Еўрапарламента Яцэк Сарыюш-Вольскі выбраліся ў Гродна. Мелі яны там спаткацца з прадстаўнікамі беларускіх апазіцыйных груповак ды праўленнем тамтэйшага Саюза палякаў. З еўрадэпутатамі паехаў прэзідэнт Беластока Рышард Тур. Як акрэслілі еўрадэпутаты, мела гэта быць разведвальная місія перад адным з найбліжэйшых пасяджэнняў ЕП, у час якога мелі б яны прадставіць усё вастрэйшую сітуацыю ў Беларусі.*

*На здзейсненне еўрадэпутатаў (і прэзідэнта Тура), іх не ўпусцілі на тэрыторыю Беларусі.*

*— Не было сказана нам, чаму адмовілі нам уезду, — казала журналістам Барбара Кудрыцкая.*

*— Мы атрымалі такі загад, — тлумачыў на мяжы шэф змены беларускіх пагранічнікаў.*

*— У іх было заданне нас не ўпусціць, — тлумачыў прадстаўнікам СМІ польскі консул у Гродне Анджэй Крэнтоўскі.*

*Адзін з прэс-інфарматараў Еўрапейскай Камісіі Мікалай Даўгялевіч заявіў пасля інцыдэнту:*

*— Улады Беларусі ў чарговы раз паказалі, што не толькі не шануюць правоў сваіх грамадзян, але парушаюць прынятыя міжнародныя звычаі. Такая пазіцыя заслугоўвае толькі асуджэння.*

*Дадаў ён, што члены ЕП маглі падацца ў Беларусь і сустрэцца з кім хочуць, што мае вынікаць з дэмакратычнага мандату, які яны выконваюць.*

*Дзіўнае гэта тлумачэнне, паколькі той дэмакратычны мандат нелегітымны ў Беларусі, па-за відавочным парушэннем правоў чалавека ўвогуле, таксама хоць бы па прычыне факту, што Беларусь не з’яўляецца членам ЕС.*

*Яшчэ да пачатку „місіі” еўрадэпутатаў, у той самы дзень на інтэрнэт-старонках пасольства Рэспублікі Беларусь у Польшчы з’явілася асцерагальная заява Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і сувязях з СНД, якая датычыла маючага адбыцца візіту дэпутатаў ЕП. Там сцвярджаецца: „Нанава планаваны «ваяж» дэпутатаў ЕС ад Польшчы з мэтай правядзення сустрэч з нелегітымнымі ўладамі грамадскай арганізацыі «Саюз палякаў на Беларусі» па сутнасці з’яўляецца правакацыяй, не спрыяе наладжванню міждзяржаўнага дыялога, мае на мэце далейшую эскалацыю напружанасці ў стасунках паміж Беларуссю і Польшчай ды распальванне варожасці паміж народамі”.*

*Тыдзень раней шэф аддзела па справах змагання з тэрарызмам беларускага Камітэта дзяржаўнай бяспекі заявіў, што палітыкаў, якія падаюцца ў Беларусь без запрашэння ўлад, можа сустрэць адмова ўезду. Тры дні да „місіі” ў сваю чаргу віцэ-міністр замежных спраў Беларусі Аляксандр Міхневіч сказаў, што Беларусь гатова да размоў з Польшчай у справе палагоджання крызісу ў двухбаковых адносінах, але „ініцыятыва цяпер належыць Польшчы”. Магчыма, аб гэтых сігналах еўрадэпутаты не ведалі, а калі ведалі, дык іх паводзіны былі свядомым дзеяннем, якое прапагандысцка дало лёгкую магчымасць беларускаму боку ўжываць хоць бы слова „правакацыя”. Не веру, вядома, у добрыя інтэнцыі беларускіх улад, якія заклікаюць да правядзення свайго роду круглага стала для развязкі канфлікту. Ёсць небяспека, што мог бы ён прыслужыцца легітымізацыі ўрада Аляксандра Лукашэнкі. Тым не менш, абавязкова трэба размаўляць, але пазбягаючы тэатральных жэстаў, з адчуваннем (і веданнем) намераў, якія спадарожнічаюць другому баку. Значыць, трэба апрацаваць зразумелы і вельмі канкрэтны план, і, урэшце, вызначыць, хто і на якім узроўні пачне размовы. Тут шмат залежыць ад дыпламатычных службаў. На маю думку, паход чацвёркі еўрадэпутатаў у Гродна не прыслужыўся гэтай справе.*

*Цікава, дарэчы, што ў Гродна не ўпусцілі прэзідэнта Беластока. Яго паход у той дзень і з гэтай групай ніяк не адносіцца да польска-беларускага супрацоўніцтва на самаўрадавым узроўні, якое мела быць аддзеленае ад вялікай палітыкі.*

**Мацей Халадоўскі**

*Звычайны фільм з-пад знаку Фабрыкі доўжыўся шэсць-дзесяць гадзін, ды ўзнікаў за адзін дзень. Канкурэнцыя, значыцца, Галівуд, шалела ад зайздрасці...*

# Цыганскае сонца ў Карпатыі(2)

**Джгар Эндзі Ўорхала**

Эндзі Ўорхал, легендарны кароль амерыканскага поп-арту, перакуліў дагары нагамі не толькі мастацтва XX стагоддзя, але і назначыў кірунак для андэргграўндавых фільмаў. Пра свае фільмы гаварыў: „Найбольш мне падабаецца тое, што іх не трэба глядзець, бо і так вядома, пра што яны”. Вось у культавым *Сне* паказаны запіс сну Джона Дж., маклера і паэта-аматара ў адным. Вядома пра 600 фільмаў Ўорхала, большасць якіх узнікла ў эксперыментальнай кінастудыі *Фабрыка*. Як прынцып, пазбягалі яны канкрэтнага сцэнарыя і роляў, іграў той, хто першы здолеў дапхнуцца да камеры і выказаць свой маналог. Замест выдуманых дзеянняў, як у галівудскіх прадукцыях, творы *Фабрыкі* паказвалі хаатычныя адрэзкі рэчаіснасці. Напрыклад, як герой некалькі гадзін механічна сексуе, шлындаецца па горадзе без толку і патрэбы або цягне пустую гутарку...

Мы, вядома, зразу і заблыталіся ва ўорхалаўскі сцэнарый. Прытым, з розуму звяла нас народная прыказка, якая абяцае што *язык да Кіева завядзе!*

Вось у Барвінку нам падказалі вандраваць паўз польска-славацкую мяжу. Ужо пасля першых кіламетраў мы адчулі хітрыкі той інфармацыі, нават маніпуляцыю:

— Ці добра ідзем у Медзылярборцы? — пытаемся ў першай лэмкаўскай вёсцы.

— Добра, гэй! — кажуць, што патутэйшаму значыць „так-так”. Паводле першых, перад намі яшчэ дзесяць кіламетраў.

Ідзем згодна з картай і ўказальнікамі, аднак, у другой вёсцы раяць нам павярнуць са шляху.

— А колькі яшчэ кіламетраў?

— Трыццаць два!

У трэцяй вёсцы кажуць пра пяцьдзесят кіламетраў.

Хоць нічога ўжо не разумеем, ідзем далей. Лэмкаўскія вёскі ў многім напамінаюць нашы беларускія. У іх найбольш старэчаў, час ад часу сустракаем дачнікаў. Няма тут ні крамаў, ні рэстаранаў, ці моднага сярод славакаў агратурызму. Усюды, як і ў нас, маркотнасць, ціш, сум па даўнейшым жыцці. Зрэдку сустрэнеце *газду*, часцей *газдзіну*, што корпаюцца ў агародзе.

У чацвёртай вёсцы паінфармавалі нас, што ў Медзыляборцы пятнаццаць кіламетраў. Прытым вёска ляжыць два кіламетры ад папярэдняй. Толькі тады нам пасвятлела ў мазгах. Горцы адчуваюць прастору не па кіламетрах, а па гадзінах, старыя ўвогуле не разумеюць пытання пра кіламетры. Затое мы зразумелі ўміг, чаму пра фільмы Эндзі Ўорхала механічна пытаюць: *А колькі гадзін ён цягнецца?*

Каб усё было ясна, звычайны фільм з-пад знаку *Фабрыкі* доўжыўся шэсць-дзесяць гадзін, ды ўзнікаў за адзін дзень. Канкурэнцыя, значыцца, Галівуд, шалела ад зайздрасці.

* * *

Даследчыкі і фанаты Эндзі Ўорхала чамусьці паўтараюць, што мастак, быццам, нарадзіўся ў Форэст-Сіці, у Пітсбургу, Медзыляборцах, Вархолах... Папраўдзе, нарадзіўся ён у Міковай, у тры гадзіны дарогі ад Медзыляборцаў, куды і завітала нашая тройца.



*Хіжа — традыцыйная хата лэмкаў, у падобнай жылі продкі Эндзі Ўорхала*



*Грэка-каталіцкая царква ў Міковай*



*На панадворку караля амерыканскага поп-арту*

Праўда, пад уплывам інфармацыйнай маніпуляцыі, мы таксама не ведалі, куды падацца — ці ў Медзыляборцы, ці ў Вархолы... Тая доза хаосу, у пэўным сэнсе, падрыхтавала нас на сустрэчу са светам Эндзі. Ён сам распаўсюджваў легенды пра сваё паходжанне, пра месца і год свайго нараджэння. Раз гаварыў, што нарадзіўся ў 1927 годзе, другі — што ў 1928, трэці — у 1933... Адзінай грунтоўнай дэталлю, якая пастаянна з'яўляецца ў яго біяграфіі, гэта дзень народзінаў, — з'явіўся напярэдадні святой Ганны, 6 жніўня, у сям'і Юліі і Ондрэя Вархолаў, як трэці сын. У гонар бацькі ахрысцілі яго Андрэем.

На простую дарогу вывеў нас незнаёмы горац, які з'явіўся на нашай дарозе, і больш за дваццаць кіламетраў, дарма, вёз на панадворак караля поп-арту.

— Я ведаю, куды вам трэба! — сцвердзіў, калі пачуў нашую нерашучасць, ці сапраўды варта ехаць у Медзыляборцы.

Нашага кіроўцу таксама нервавалі даследчыкі, якія паўтараюць таксічныя ньюс, нібыта Эндзі Ўорхал быў па паходжанні чэхам, славакам, палякам, амерыканцам...

— А і так усе тут ведаюць, што быў украінцам.

Наш субяседнік хадзіў у школу, дзе ўсе прадметы выкладаліся на ўкраінскай мове.

— Зараз, — дадае, — сталі вучыць таксама па-славацку.

Частка лэмкаў не прызнаецца да ўкраінскасці ды называе сябе *русынамі*. Слова *лэмко* — літаратурная выдумка канца XIX стагоддзя, паходзіць ад слова *лэм* — што па-нашаму значыць „але”. Лэмкі насяляюць усходнюю частку Бескідаў і частку Карпат паміж рэкамі Сан і Попрад ды тэрыторыю на захад ад ракі Уж. Самая вялікая кампактная група насяляе наваколле Жэшава, Горліц, Прэшава, Ужгарада.

На пачатку Міковай бачым двухмоўную табліцу-ўказальнік: па-славацку і па-ўкраінску. У вёсцы сустрэнем яшчэ праваслаўную і грэка-каталіцкую цэрквы. Мікова доўжыцца за два кіламетры паўз горскі паток, хоць напамінае вялікае гняздо, з кожнага боку атуляюць яе горы.

— І амаль усе людзі маюць тут прозвішча Вархоля, — кажа нам дачнік, што сам рамантуе старую *хіжу* — домік. З яго дапамогай адшукаем жаданы панадворак. Месца напамінае мне беларускія *меккі культу*, — яно забытае і непрыкметнае, сляды парастае буйная трава.

— Вінаватыя ўсякія праекты! — наракае цётка Эндзі — Мар'я Вархалёва.

Пачаткова музей меў знаходзіцца ў яе трохпавярховай мураванцы, аднак, як шэпчуцца у Міковай, перашкодзіла сямейная зайздрасць...

*(працяг будзе)*

**Тэкст і фота Евы Сцепанюк**

## *Абнаўленне Мілейчыч*

Мілейчыцкая гміна налічвае 20 салэцтваў, распалажаных сярод хваёвых лясоў. На яе 15000-гектаровай тэрыторыі пражывае каля 2,4 тыс. чалавек. У 1999 годзе гміна налічвала 2,9 тыс. жыхароў. Гміна мае сельскагаспадарчы характар.

У Мілейчыцкай гміне найбольш гравеек ды брукаваных дарог. У мінулым годзе паклалі асфальт на 3-кіламетровым адрэзку дарогі вядучай ад вуліцы Новы свет у Мілейчычах да вуліцы Ялтушчыкі. Маюць яго зараз вуліцы Паркавая і Новая. У гмінным цэнтры амаль усе вуліцы асфальтаваныя.

У 2004 годзе ваду з крана атрымалі жыхары прысёлкаў Харашчэва і Паканева, а год раней вёскі Мікулічы, Навасёлкі, Баравікі, Рагачы, Мядзвежыкі і Левашы. На ваду чыстую як крыштэль чакаюць жыхары Галубоўшчыны і прысёлка Валкі.

Сёлета ў гміне мадэрнізуюць вулічнае электраасвятленне. Інвестыцыя будзе каштаваць 300 тысяч злотых (20% яе пакрые еўрасаюзны бюджэт).

У Мілейчычах вельмі прыгожае вадасховішча. Тут пабудуюць мол і памост для байдарак і лодак ды для аматараў купання. На вадасховішчы плануюць насыпаць востраў.

Па вуліцы Паркавай у Мілейчычах закончылі рамонт будынка, у якім будзе святліца.

**(мох)**

## *Запэцканая Гайнаўка*

У Гайнаўцы на сценах шматлікіх дамоў і будынкаў іншага прызначэння крымзолі. Нават у цэнтры горада. Найбольш па вуліцах 3 Мая, 11 Лістапада і Дварцовай. Запэцканыя сцены будынка пачакальні на чыгуначным вакзале. Вось такое знішчэнне маёмасці.

Надпісы і рысункі-эскізы на сценах не маюць нічога супольнага з мастацтвам, не адлюстроўваюць ніякай думкі, а толькі псуюць выгляд. А бываюць яшчэ і непрыстойныя.

Уладальнікі дамоў і іншых будынкаў наогул дбаюць пра іх чысціню і эстэтыку. Яны гавораць, што немагчыма ўвесь час аднаўляць будынкі, калі на свежапамаляваных сценах зноў з'яўляюцца надпісы і непрыглядныя малюнкі.

**(мох)**

## Выстаўка ўбораў у бельскай ратушы

Музей у ратушы ў Бельску-Падляшскім па вул. А. Міцкевіча, 45 запрашае на выстаўку „Народны ўбор беларусаў на Падляшшы". Выстаўка будзе працаваць на працягу жніўня і верасня г.г.

За дэталёвай інфармацыяй можна звяртацца па тэл. 730 22 44.

**(мох)**

# Бандароўская гасцёўня




*На заканчэнне фэсту ўсе калектывы арганізатарам і спонсарам праспявалі „Многае лета", а з публікай развіталіся песняй-гімнам „Люблю наш край"*

**На пагорку — пляцоўка для фэсту, а за ёю адкрываецца від на даліну ракі Нарвы, забудову вёскі Бандары і ейныя лугі, лясы і палеткі. Вось у такім маляўнічым антуражы ў суботу, 23 ліпеня, у 17 гадзін, прагучэлі словы песні „Ах як прыгожа, што ў вас сёння свята...", з якой пачаўся беларускі народны фэст у Бандарах.**

Першым з прывітальнай прамовай выступіў войт Міхалоўскай гміны Марк Назарка, які падкрэсліў значэнне фэсту ў жыцці мясцовага насельніцтва. Старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі ў сваю чаргу адзначыў, што — як правіла — фэсты ладзяцца там, дзе ёсць адпаведнае асяроддзе, калектывы, арганізатары і падтрымка мясцовых улад. Тое, што фэст у Бандарах мае ўжо 5-гадовую традыцыю, гэта самы лепшы доказ, што ён мясцоваму грамадству проста неабходны. Гэтую думку пацвердзіла солтыс вёскі Бандары Ніна Лукша, якая сказала, што жыхары навакольных вёсак рыхтуюцца да гэтага свята цэлы год.

Канцэрт пачаўся з выступлення хору „Крыніца", апранутага ў прыгожыя народныя касцюмы. Затым вядучыя — сакратар ГП БГКТ Валянціна Ласкевіч і загадчыца Міхалоўскага цэнтра культуры, спорту і адпачынку Малгажата Кнот — запрашалі на сцэну чарговыя калектывы: мясцовыя „Ток-Арт", „Крэс", „Сінгерс" і дуэт „Госька і Кшысь", беластоцкі гурт „Зорка" ды гасцей з Беларусі — ансамблі „Грымата" і „Медуніца". Загучалі песні на беларускай мове, шчырыя, непаўторныя, глыбока кранаючыя душу — галасы мінуўшчыны і сучаснасці.

— Запрасіла нас сюды БГКТ, — сказала кіраўнік ансамбля народнай музыкі і песні „Грымата" са Слонімa Валянціна Шаронава. — У Бандарах сустрэлі нас як даўніх сяброў, паколькі выступалі мы тут у 2000 годзе. Гэта было вельмі ўражальнае мерапрыемства, прымалі нас на ўра, таму і на гэты раз прынялі мы запрашэнне з вялікім задавальненнем.

Народны ансамбль „Медуніца", якім кіруе Генадзь Паноў, наведаў Беласточчыну трэці раз. У калектыве, які існуе ўжо 16 гадоў, выступае 12 самадзейнікаў. Радасна станавілася на душы, слухаючы гучную і сакавітую родную мову ў вуснах беларускіх спевакоў.

Асабліва прыемна было пабачыць і паслухаць на сцэне маладых спявачак з Міхалова, якія прыцягваюць публіку не толькі сваёй прыгажосцю і прывабнасцю, але перш за ўсё зладжанасцю галасоў.

Задорныя і бадзёрыя песні заахвочвалі публіку танцаваць і ўторыць спевакам. Раптам з лавачакі паднялся і пусціўся ў скокі няўрымслівы мужчына, выконваючы складаныя акрабатычныя фігуры. Ніхто не мог і падумаць, што гэтаму гнуткаму танцору ўжо за пяцьдзесят.

Пахмурнае надвор'е не бянтэжыла арганізатараў і ўдзельнікаў мерапрыемства. На іх тварах свяцілася радасць, а кожная ўсмешка, быццам маленькае сонейка, сагравала душу і сэрца. І, мабыць, ад гэтага прыўзнятага настрою неба пачало рассвятляцца, паказалася сонейка, якое палетняму, пяшчотна ахінула праменнямі ўдзельнікаў фэсту.

Фэст у Бандарах мае ўжо 5-гадовую гісторыю і ў сувязі з юбілеем атрымаў назву „Бандароўская гасцёўня". За гэты час прыдбаў ён верную публіку. На свята беларускай народнай песні з'язджаюцца не толькі мясцовыя, але і жыхары іншых рэгіёнаў Польшчы ды замежжа — выхадцы з Бандароў і навакольных вёсак. Прыбываюць таксама былыя жыхары (цяпер ужо пенсіянеры) затопленых на дне Семяноўскага вадасховішча вёсак Лука, Буды, Боўтрыкі, Рудня, Гарбары. Сёлета на аўтобусах прыехалі таксама пенсіянеры з Гайнаўкі і Беластока. Мілагучныя беларускія песні прываблівають таксама турыстаў, які адпачываюць на пляжы ў Рудні.

Беларускі фэст у Бандарах — сімвал яднання народаў. Менавіта тут пачынаеш задумоўвацца колькі агульнага ў беларусаў і палякаў — у гісторыі, культуры і звычаях ды разумець, што ніякія моўныя бар'еры не перашкаджаюць выказваць самыя шчырыя чалавечыя пачуцці, жыць у сяброўстве, ставіцца да сябе з пашанай.

На фэсце ў Бандарах, гаварылі ўдзельнікі мерапрыемства, можна было ўявіць сабе побыт беларусаў у мінулым, так ярка адлюстраваны ў народных песнях. Слухаючы выступленні калектываў, перад вачамі паўставалі карціны сялянскіх сядзіб, рэк і азёраў, лясоў і дарог, адным словам — вобраз роднай Маці-Беларусі.

Пасля канцэрта, да белай раніцы, працягвалася народнае гулянне пад гукі калектыву „Зорка" з Беластока. Над роўняддзю вадасховішча і прылягаючымі да яго лясамі лунал беларускія і польскія песні, гучэла беларуская і польская мовы. А на ўрачыстай вячэры ў клубе „Карына" Аліны і Рамана Ляткоўскіх арганізатары фэсту сустрэліся з членамі калектываў, якія выступілі перад бандарскай публікай.

Вялікі дзякуй гасцінным і руплівым арганізатарам — гаспадарам „Бандароўскай гасцёўні" за народны фэст. Гэтае мерапрыемства, як і астатнія беларускія фэсты, напаўняюць новым зместам наша жыццё, прапагандуюць культурныя вартасці. На маю, ніжэйпадпісанага, думку, пры разумнай арганізацыі агратурызму, фэсты не толькі маглі б узбагаціць турыстычную прапанову Усходняй Беласточчыны, але з цягам часу маглі б даць прыбытак. Але ні з чым не параўнаць той выхаваўчы эфект, які яны аказваюць на наша грамадства. Лічу, што беларускія фэсты трэба праводзіць на розных узроўнях, іх павінна быць значна больш.

Хацелася б шмат пра што расказаць і напісаць, але лепш самому пабачыць як людзі цягнуцца да беларускасці, аднаўляюць традыцыю. Таму заахвочваю чытачоў прыехаць у Бандары ў наступным годзе, калі беларускае свята народнай творчасці зноў згуртуе любіцеляў роднага.

**Віктар Бура**

## *Дапамога інвалідам*

*Паводле апошняга перапісу насельніцтва на тэрыторыі Бельскага павета пражывае звыш дзесяці тысяч інвалідаў (16,3% ад агульнай колькасці насельніцтва павета). Без дапамогі дзяржавы яны не маглі б самастойна рашаць сваіх важных праблемаў. З мэтай зраўнання іх жыццёвых шансаў павятовае самакіраванне падтрымлівае са сродкаў Дзяржаўнага фонду рэабілітацыі інвалідаў іх прафесіянальную і грамадзянскую рэабілітацыю. Задачы павета ў гэтым напрамку выконваюць Павятовы цэнтр дапамогі сям'і і Павятовая ўправа працы.*

*Паводле Уршулі Кітляс, загадчыка ПЦДС у Бельску-Падляшскім, у мінулым годзе Бельскі павет на дапамогу інвалідам атрымаў са згаданага фонду звыш 720 тыс. злотаў. Акрамя таго павет далучыўся да праграмы нівеліравання міжрэгіянальных розніц, на якую фонд выдзеліў звыш 410 тысч злотаў. У рамках гэтай праграмы самаўрадавыя, прадпрымальніцкія і грамадскія суб'екты выканалі шмат задач, з ліку якіх найважнейшыя: купля двух транспартных сродкаў для перавозкі інвалідаў, уладкаванне шасці новых працоўных месц інвалідам, пашырэнне рэабілітацыйнай базы шляхам куплі новых прыладаў для рэабілітацыйных асяродкаў, у пяці аб'ектах грамадскага карыстання збудаваны пад'езды для інвалідскіх калясак.*

*У канцы мінулага года ў Бельскім павеце 13 працадаўцаў атрымала дафінансаванне для 175 уладкаваных у іх інвалідаў. У той час у Павятовай управе працы было зарэгістраваных 143 беспрацоўных інвалідаў і 14 шукаючых працы.*

**Міхал Мінцэвіч**

# Вёска ў пашчы пушчы

**Паказальнік дарог за Кузніцай вызначае напрамак у Візгі і інфармуе, што ў тую мясцовасць ад гміннага цэнтра пяць кіламетраў. І гэта ўсё. Жвіроўка пралягае ў маляўнічым краявідзе. Побач дарогі палеткі з бульбай, жытам, аўсом, грэчкай і лубінам. Нівы ўпрыгожваюць пустазельныя дадаткі, якія з асаблівай напорыстасцю накідаюцца на пасевы з боку здзірванелай пабочыны. У бульбе выграваюцца чырвоныя лічынкі каларадскага жука.**

Між ніў шмат аблагоў, якія выносяць на сонечнае святло свае выдатна захаваныя зёлкі. Здараюцца апусцелыя прысаддзі, што асталіся пасля пакінутых у іх цэнтры сяліб. Палі перамяжоўваюцца з лясамі рознай старасці — шматпакаленных, якія пастунова выцясняюць з мясцовага краявіду шматпакаленныя сем'і. Наступ лясоў паказвае своеасаблівым чынам адступленне з гэтай тэрыторыі людзей. І чым далей ад гміннага цэнтра, тым шчыльней лес прытуляецца да дарогі, часам ахінаючы яе нават з нябеснага боку і ў падарожніка складваецца ўражане нейкага ўрачыстага сцэнічнага афармлення, быццам у раслінным тунелі. Чысты прыродны водар ад таго багацця расліннага свету прыводзіць на думку пахі нейкай кухні асаблівага духовага рэстарана. Цывілізацыйная цішыня прыдае ў такіх момантах адчуванне ашчасліўленасці, быццам у раю. У думках нават кранаю рэбры, ці каторае з іх не фемінізуецца...

Разгаліноўванне аднолькавых дарог, лясных рукавоў, без паказальніка ставіць перад чужынцам дылему: куды далей падацца. Прыглядаюся да абодвух дарожных ветак, намагаючыся ўбачыць нейкую логіку таго разгаліноўвання. Логіку падмяняе нейкае наўгадлівае пачуццё, якое кіруе мяне направа. Мой інтуітыўны нюх апраўдваецца: за згібам ляснога калідора сюрпрыз — перада мною дарожны знак, пасведчанне наяўнасці тут вёскі Візгі. Знак звязаны шнурком з крыжам, на якім просьба захаваць людзей ад усялякага зла...

Маё з'яўленне каля другога панадворка апавяшчае сабака. Дваіх мужчын кіруюць мяне ў хату Яна Мальчыка. Гаспадар расказвае пра сваю асаблівую вёску.

Зараз пасля вайны Візгі налічвалі каля сарака хат. Бадай у 1935 годзе палова вёскі згарэла. Жанчына пякла хлеб, з печы выпала на падлогу жарынка і так узнік вялікі пажар. Пасля вайны людзі сталі выязджаць хто куды: у Беласток, у Саколку, у Кузніцу... Каля васьмі сем'яў выехала ў Савецкі Саюз; некаторыя з іх паехалі дабравольна, а да іншых прыходзілі ўначы і пыталі:

— Kiedy wyjedziesz do Stalina?

Выехалі яны галоўным чынам у Гродна. Часта прыязджалі на сваю бацькоўшчыну. Спачатку шкадавалі сваіх гаспадарак, а пасля прывыклі да новых абставін. І тыя, што асталіся, да іх ездзілі, прывозілі тэлевізары, кажухі...

Пытаю пра стаў і разваленьі мур, якія асталіся каля кіламетра перад Візгамі.

— Там, у Кавалях-Калёніі, — кажа спадар Мальчык, — да вайны маёнтак быў, жыд у ім жыў. Было ў яго дзвесце гектараў зямлі, а там, дзе рэшткі муру, была гарбарня і тры ставы; цяпер яны пазарасталі. Сам гаспадар жыў у драўляным будынку. Летам прыязджалі да яго жыдоўскія дачнікі з Беластока і Варшавы, купаліся ў ставах, бо ў іх была чыстая вада. У вайну гаспадара забралі немцы. А мураваныя будынкі людзі расцягнулі пры, бадай, Гамулцы. Камяні з іх вазілі на станцыю ў Кузніцу, а адтуль паяздамі развозілі той матэрыял недзе па Польшчы. І са сваіх калёніяў людзі многа камення вывезлі...

Цяпер у Візгах асталіся тры хаты ў вёсцы і чатыры на калёніі, у іх больш-менш па дзве асобы жыве — наймалодшаму жыхару каля сарака гадоў. Штодзень заязджае туды самаход: адзін з Сідры, а адзін з Мялешкаўцаў — усё можна купіць. Каб да лекара ў Кузніцу дастацца, трэба сямейнікаў клікаць або каго наймаць. Часам дзяўчына з Caritasu прыедзе, ціск змерае, укол дасць...






Людзі трымаюць крыху курэй. На ўсю вёску адна карова, а малако людзі з самахода купляюць. У вёсцы адзін сабака, і на калёніі адзін...

Час мне збірацца ў дарогу. За вокнамі штораз больш напорыста падае не надта густы дождж. Гаспадары настойліва запрашаюць мяне аставацца, пераначаваць у іх. Мо палічылі мяне нейкім гуру, экстрасенсам, якому цудадзейна ўдалося пераадолець засакрэчаныя лесам подступы ў іхнюю саступаючую вёску і мо яшчэ так жа ўдасца запыніць тое саступленне...

**Тэкст і фота**
**Аляксандра Вярбіцкага**



Рэшткі былой гарбарні

## У Кляшчэлях

Нядаўна падаўся я ў Кляшчэлі. У цягніку сустракаю пенсіянера з Вулькі-Тэрахоўскай, які едзе на кірмаш, як і я, дзеля цікаўнасці.

— Герак добра рабіў, што ўспамог гаспадароў, — пачынае гутарку Васіль Верамчук. — Даў магчымасць гаспадарання. Бяры поля колькі хочаш, апрацоўвай зямлю і плаці падатак. Разумеў, што селянін лепш задбае аб сваю ўласнасць, чым чыноўнік аб дзяржаўную маёмасць. Зараз у нас няма акуратнага гаспадара. Палітыкі адно перад выбарамі абяцанкамі кормяць, а замежныя фірмы не плацяць падаткаў...

Са станцыі ў Кляшчэлях падаемся гравійкай праз сенажаці. Адны ўчасткі скошаныя, іншыя парастаюць крапівой. Меліярацыйныя равы неабкошаныя, цёку вады не відаць, хоць дажджу апошнім часам натура не паскупіла.

На рынак даязджаем моўчкі. Па абодвух баках брукаванага пад'езда расстаўлены прылаўкі з гароднінай, шмат агуркоў і памідораў, цана даступная. Агурочкі па 1,50 зл. кілаграм, а памідоры на залатоўку больш. Маленькая галоўка капусты па 2,50 зл. Далей у шарэнгу выстраіліся купцы з вопраткай і абуткам, сельскагаспадарчымі прыладамі. У канцы некалькі фурманак з парасятамі, якія цэняцца ад 250 да 300 злотых. Збожжа амаль няма. Адзін малады чалавек прадае мяшанку ячменю з аўсом, па 25 злотых цэнтнер, столькі ж і за лубін. Пра цану жыта ўсяляк гавораць. У Бельску скупшчыкі быццам бы па 9 зл. за цэнтнер прапанавалі. Ды якая ж гэта рынычная эканоміка!

Прыпамінаю зноў геркаўскія часы, калі ў сталіцу па каўбаску ездзілі. Варшавякі з пагардай глядзелі на прыезджых і з'едліва гаварылі: „Wiocha przyjechała!" Быццам зайздросцілі земляробу ягонай долі. Гараджане прыдумалі нават прыказку: „Chłop śpi, a jemu rośnie!" А зараз што маем? Вясна была мокрая, але халодная. Сады, як квеценню асыпаліся, дык замаразкі іх прыхапілі. Калі ўраджай збожжа прадказваўся нядрэнны, дык наступіла нечаканая засуха, зерне высушыла. У час жніва дождж не дазваляў з поля звезці плён. Яшчэ дагэтуль збожжа стаіць някошанае. Некаторыя гаспадары кажуць, што збожжа пакінуць на полі, бо за камбайн больш трэба плаціць, чым яно вартае. Вось які лёс сучаснага земляроба!

**Уладзімір Сідарук**

## Пад вокладку

Прапаную „Ніве" выпусціць асобны зборнік з найлепшымі вершамі і апавяданнямі ніўскіх карэспандэнтаў. Хаця гэтыя творы пабывалі ўжо на старонках нашай роднай газеты, але ж вядома, што памяць падводзіць, а кніга такая была б карысная не толькі старэйшаму, але і малодшаму пакаленню; была б яна добрай памяткай.

Запрашаю чытачоў выказацца наконт маёй прапановы.

**Мікалай Панфілюк**



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)


# зорка

для дзяцей і моладзі





*Гарадоцкія гімназісты ў пастаноўцы пра жніво*

## Вершы Віктара Шведа

### Ашчадная мама

*— Надта дарагі мой татка,*
*Ашчаджанне — наша крэда.*
*Вельмі ашчадная матка,*
*Я раней аб тым не ведаў.*

*Прыглядаюся ёй штодзень,*
*Як шмат афармляе рэчаў.*
*У сваё трыццаціголддзе*
*Запаліла дваццаць свечак.*

### Колькі каштуе шлюб?

*Татульку з абавязку*
*Спытаў сынок Якуб:*
*— Скажы мне, калі ласка,*
*Колькі каштуе шлюб?*

*Бацька яму не гэта*
*Са смуткам уваччу:*
*— Няма, сынок, сакрэту,*
*Я ўсё яшчэ плачу.*

# Як гаспадар дзень расцягваў

*(казка)*

Адзін гаспадар зусім замардаваў сваіх работнікаў. Яны так і працавалі з раніцы да позняй ночы — ад цямна да цямна, а яму здавалася і гэтага мала, — усё бурчэў ён, што дзень вельмі кароткі, а плата работнікам вельмі высокая. Хутар вялікі, зямлі ў гаспадара сто гектараў — здаецца, што яшчэ трэба чалавеку! — дык не, адолела яго прагнасць. Ходзіць ды бурчыць, ходзіць ды бурчыць.

Надакучыла бурчанне гаспадара аднаму работніку, вось ён і сказаў яму, што дзень можна расцягнуць. Трэба, кажа ён, насадзіць сонца на вілы ды трымаць колькі хочаш, каб не рухалася на небе!

Узрадаваўся гаспадар. Пабег да каваля, заказаў вялікія вілы. Насадзіў вілы на доўгую жэрдку. Прымерваецца да сонейка, з якога боку насадзіць яго ямчэй, а работнікам кажа:

— Цяпер працаваць вы будзеце да таго часу, пакуль я буду трымаць віламі сонца! Каму не падабаецца, можа ісці на ўсе чатыры бакі! — і ўзлез на ўзгорак.

У поўдзень падняў ён вілы да сонца і стаў трымаць...

Мінае гадзіна, мінае другая. Стаяў, стаяў гаспадар, потам абліваецца, рукі-ногі дрыжаць, паясніцу ломіць, сілы больш няма. Вываліліся ў яго вілы з рук, а ён і нагнуцца не можа.

Работнікі бачаць — гаспадар ужо не трымае сонца, таксама працу кінулі. Угавор — дык угавор!

Гаспадар на сонца глядзіць, ледзь ад злосці не лопнецца, — сонца яшчэ высока, а работнікі да дому павалакліся.

Паплёўся і ён да сябе.

А гаспадыня — свайму мужу пара — суцяшае яго:

— Ты, галубчык, заўтра прытрымай сонейка ад вечара, яно тады стаіць ніжэй, — трымаць будзе лягчэй!

Добра. Назаўтра гаспадар да вечара ў пасцелі ляжаў, ледзьве ўстаў. І зноў на той жа ўзгорак, з віламі. Праўду жонка казала — сонца стаіць нізка. Падняў гаспадар вілы, думае: „Я іх прымушу працаваць лайдакоў!”

Толькі ў гэты раз яму яшчэ здалося цяжэй. З гадзіну патрымаў вілы ў руках, замітусілася ў яго ў вачах, пайшлі чырвоныя кругі, — і паваліўся гаспадар на зямлю, як сноп. Ледзь-ледзь гаспадыня прымусіла яго ўстаць.

— Ты, галубок, заўтра перад самым захадам вазьміся!

Паглядзеў на яе гаспадар, нічога не сказаў.

Больш ён дня не расцягваў.

*(Паводле зборніка „Залаты скарб”)*

# Алёшка Рудакоў з Іркуцка




Алёшка Рудкоў прыехаў у Беласток з татам Алегам, шэфам суполкі іркуцкіх беларусаў. У Польшчы ён першы раз, хоць у сваіх далёкіх падарожжах зведаў ужо Фінляндыю і Швецыю, быў на Украіне. Праўда, далёка, бо ж яго родны горад Іркуцк ляжыць у Сібіры, над вялікім і глыбокім возерам Байкалам. А Алёшка, як і ягоны тата — беларус. Лёс раскідаў беларусаў па ўсім свеце. Рудаковы, як і іншыя беларусы на чужыне, трымаюцца разам, падтрымліваюць кантакты адны з аднымі. Алёшка, якому трынаццаць гадоў, таксама вывучае сваю мову, бо яна, як ніштo іншае мацуе народ.

— Мову пазнаю з таго часу, як нарадзіўся, — нават крыху здзівіўся на маё пытанне Алёшка. — А афіцыйна вывучаю яе ў клубе „Зярнятка”. На занятків ходзяць 12 дзетак. Збіраемся на навуку раз у тыдзень.

Алёшка перайшоў у восьмы клас. Вучыцца ў адзінаццацігодцы, якая дае сярэднюю адукацыю. Любіць матэматыку, біялогію, гісторыю, рысаваць ды ездзіць на ровары. Яшчэ не ведае, кім хацеў бы працаваць. Алёшкава мама Таня — ваенны ўрач. Тата Алег прывёз сына пазнаёміцца з нашымі беларусамі. І вы таксама можаце пазнаёміцца з Алёшам, вось яго электронны адрас: *alex_rudakou2@mail.ru.*

**Міра Лукша**

№ 34 [21-08-2005]

# Чайкі

У нашай ваколіцы, пасля пабудовы вадасховічша ў Семяноўцы, паявіліся птушкі, раней мы якіх не бачылі альбо бачылі вельмі рэдка, якія аблюбавалі воднае асяроддзе. Між іншым гэта **чайкі** — звычайная (азёрная), малая, серабрыстая, трохпальцая і шызая. **Азёрная** — самы папулярны від чаек. Селіцца яна на азёрах, ставах, балотах, старыцах рэк, дзе добра развінутая расліннасць, корміцца насякомымі, рыбай, дажджавымі чарвякамі, грызунамі, харчовым адкідамі. Апярэнне ў яе ў шлюбны перыяд галавы карычневае, крылы шэрыя з чорнымі канцамі, а ў іншы час — белае, дзюба, ногі і край павек вішнёвага колеру. Прылятае ў канцы красавіка, азываецца „к'яр!". Гняздуецца калоніямі, часам па некалькі соцень пар. Даспявае ў два гады. Гнёзды робіць на купінах травы, кладзе па 2 — 4 яйкі, наседжвае іх 23 дні. Адлятае ў жніўні — пачатку верасня, зімуе на ўзбярэжжах Заходняй Еўропы. **Чайка малая** — занесеная ў Чырвоную кнігу, найменшая з чаек, з ружаватым жыватом, зімой галава ў яе белая з бураватай плямкай каля вока. Зімуе яна м.інш. над Каспійскім возерам. Чайка **серабрыстая** (гагатуха) — самая буйная з чаек, размах яе крылаў сягае паўтара метра. У большасці яе апярэнне блакітна-шэрае. Азываецца яна: „ха-га-га", „йох-йох-йох!" і „к'яў". Ёсць яшчэ чайкі **тонкадзюбая** („марскі галубок"), **трохпальцая** (мыеўка) ды **шызая**.

Чайкі, прыляцеўшы з выраю зарана, трапляючы на непагоду ды раптоўныя змены надвор'я (кажуць, праўда, што птушкі прадказваюць пору адпаведную для прылёту), маюць шмат клопату, каб утрымацца пры жыцці. Тады і не пракормішся, а што гаварыць пра ўзвіццё гнязда. Год таму чайкам, якія прыляцелі на вясну на свае месцы над вадасховішчам у Дайлідах пад Беластокам, прыйшлося прасіць ратунку ў людзей. Прылятали яны карміцца ў цэнтр Беластока, акупіравалі сметніцы пасярод горада, насіліся паміж высокімі блёкамі з адчайным крыкам. Крыху дзіўна выглядалі гэтыя вялікія дастойныя птахі пасярод плоймы варон, галубоў ды вераб'ёў, звычайных у гарадскім краявідзе. У цяжкі час змагацца прыходзіцца жорстка за ежу, каб пражыць, усім стварэнням.

*Міра Лукша*



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

# Ужо сумую па „Басовішчы"

*Дарагая „Зорачка"! Мне так прыемна было паглядзець на тваіх старонках здымкі з „Басовішча". Сапраўды, я ўвесь тыдзень чытала пра фестываль Маладой Беларусі, ды ўсё ўспамінала тую атмасферу, якой я там засмакавала...*

*Я гімназістка з Бельска-Падляшскага. У Гарадок я паехала першы раз, маім анёлам ахоўнікам і целахоўнікам як і шафёрам быў мой старэйшы брат Дам'ян. Ён ад гадоў ездзіць ў Барык, бо там — кажа — цудоўная атмасфера.*

*Праўда, не лёгка мне было выпрасіць ў бацькоў дазвол на паездку ў Гарадок! Што я не рабіла? Кожны дзень прыбірала ў хаце, пякла ўсякія пірагі, вучылася англійскай мовы, нават паехала разам з бацькамі ў вёску, каб дапамагаць сваякам у сенаванні.*

*Сапраўды, было варта!*

*Найбольш у Гарадку захапіла мяне вялікая колькасць моладзі з цэлай Польшчы і з Беларусі. Прыемна было глядзець як пад сцэнай лунаюць бел-чырвона-белыя сцягі. Зараз я буду глядзець інакш на нашую школьную насценгазету, з сімволікай Беларусі, бо яна будзе напамінаць мне пра „Басовішча".*

*Я вядома, як усе гімназісткі, закахалася! Не, не ў чароўнага маладзёну з Гродна. Маё каханне гэта гутрт „Нейра Дзюбель" з Мінска. Упершыню — на жыва я слухала культавы „Н.Р.М.", ад якога балдзеюць усе мае сябры.*

*Калі я вярнулася ў свой горад, зразу надзела кашульку з „Басовішчам" і пайшла да сяброўак. Усе мне вядома зайздросцілі. Нават бацькі, калі даведаліся, што ў Гарадку паказалася легендарная Кора, іх улюбёная рок-зорка.*

*Так што варта дапамагаць бацькам і „не стукаць" пра жарты старэйшага брата!*

*Магда К.*



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

„Бурлівы" адпачынак на летніку і...



Фота БАРБАРЫ ПЯКАРСКАЙ

„вольны" адпачынак на тым жа летніку

# Легенда пра Беларусь

Даўным-даўно на зямлі Белай Русі князь Днепраслаў узводзіў магутны замак. Многа год працаваў з дружынаю сваёй, каб ніводзін вораг не мог падступіцца да замка і авалодаць скарбамі беларускай зямлі. Калі замак пабудавалі, то ўвялі правіла: ніхто не павінен заходзіць са зброяй у яго. Госці пакідалі зброю перад варотамі, і іх сустракалі хлебам-соллю добразычлівыя беларусы. Сам Бог любіў гэтых людзей, самых мірных і працавітых у свеце. Ён даў ім багатыя лясы і прыгожыя сады, блакітныя азёры і крыніцы з гаючай вадой. Людзі складалі песні, вырошчвалі хлеб, гадавалі дзяцей і радаваліся жыццю і сонцу.

Аднойчы чорная страшная хмара завалакла неба і на замак напаўзла ўсялякая нечысць. Клікнуў дружыну Днепраслаў, загадаў мячы каваць, каб абараніць свой люд, сваю зямлю. Пачалася страшная бітва. І доўжылася яна дванаццаць дзён і дванаццаць начэй. Спярша пабілі войска чарцей, якія хацелі адабраць у беларусаў іх веру ў Бога і дабро. З пабітых чарцей павыпаўзалі ядавітыя змеі, якія хацелі атруціць чыстую ваду азёраў і крыніц. Прыскакалі пярэваратні-ваўкалакі, ненажэрныя і бяздушныя, якія марылі павытоптваць жытнёвыя палі і абтрэсці ўсе сады. Вялізную сілу даў Бог Днепраславу і дружыне яго. І сталі воямі самыя мірныя людзі-беларусы, паказалі ўсёй нечысці, што зямлю сваю ў крыўду не дадуць, што даражэй за ўсё на свеце Мір, Сонца і Свабода. І сонца выглянула зноў з-за хмар, і да гэтага часу свеціць яно працалюбівым і сумленным людзям.

Даўно няма ўжо Днепраслава, але жывуць яго нашчадкі і помняць: родная Беларуская Зямля — самая мірная і самая непрыступная для ўсякай нечысці на свеце.

*Дзіма Трушанаў, г. Мінск, СШ 3 60*

# Польска-беларуская крыжаванка № 34

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклкеевым кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.




**Адказ на крыжаванку № 30:** Плакса, шыла, сон, хам, Геня, бал, яр, зоў, ліпка, раса, раз, манастыр, тактык, рынак, крат, бародка. Опт, парк, пасеў, на, лёс, рата, снеданак, сак, кавалер, ар, весы, ты, тын, прыклад, якар, абраз, гара.

# Свято Праабражэння Гасподняга

**19 жніўня (6-га паводле юльянскага календара) Праваслаўная царква адзначае свята Праабражэння Гасподняга. У гэты дзень пасля набажэнства ў царкве асвячаецца садавіна. Айцы Царквы — Арыген, Кірыла Ерусалімскі, Іеранім ці канстанцінопальскі патрырх Прокл — вызначылі месца Праабражэння на гары Фавор, а замацаваў гэта II Канстанцінопальскі сабор у 533 годзе. Цяпер лічыцца, што месца Праабражэння знаходзіцца пад алтаром царквы, пабудаванай на гары Фавор.**

Святая гара Фавор знаходзіцца ў паўднёвай частцы Галілеі. Гэта адна з прыгажэйшых гор Палесціны, у форме паўшар'я, з выдатнай раслiннасцю на вапняковым грунце і з пышнымі краявідамі з яе вяршыні. З яе можна ўбачыць Назарэт, горад дзяцінства і маладосці Хрыста, а ў светлае надвор'е аснежаныя вяршыні горнага масіва Ермон. „Фавор і Ермон радуюцца імем Тваім" — згадвае псалом 88.

Гара Фавор, якую Ісус выбраў за месца сваёй славы, праходзіла розныя, часта трагічныя, зменлівасці лёсу. Пра яе згадваюць папірусы Рамсеса II, там яўрэйскія паўстанцы вялі няроўны бой з войскам імператара Веспазіяна. У IV стагоддзі імператрыца Алена пабудавала там тры царквы: Хрысту, Майсею і Ільі, якіх убачылі там забраныя Ісусам тры апосталы; тры царквы, бо ў час Праабражэння апостал Пётр прапанаваў паставіць Ім там тры шатры. У XI стагоддзі тое месца занялі крыжаносцы. У 1183 годзе ў праваслаўны манастыр на вяршыне гары ўварваліся атрады Саладзіна і знішчылі яго датла; большасць манахаў прыняла тады пакутніцкую смерць. У 1263 годзе султан Бірбас завяршыў разбурэнне.

Іераманах Ірынарх, будучы ўжо аскетам і старцам, пасяліўся на гары, а на руінах пабудаваў сабе скіт. У выніку ягоных намаганняў на колішніх руінах была ўзведзена і ў 1862 годзе асвечана цяперашняя царква Праабражэння Гасподняга. На гары стаіць і кляштар францысканцаў.

На склоне гары, з каталіцкага боку, стаіць старая капліца, якая ўвекавечвае словы Евангелля: „І калі сходзілі яны з гары, Ісус забараніў ім, гаворачы «Нікому не кажыце пра тое, што бачылі, пакуль Сын Чалавечы не ўваскрэсне з мёртвых»" (Матф. 17:9).



Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

*Паломнікі на Грабарцы ў 2002 годзе*

У падножжы гары распаложана арабская вёска Дабурыя, названая так у гонар прапаведніцы Дэворы (Суд., 4-5). Ісус загадаў апошнім апосталам чакаць там, пакуль вернецца з Фавора. Там, пасля зыходу з гары, Ісус аздаравіў апантанага хлопца, выганяючы з яго нячыстага духа, з якім не маглі справіцца апошнія апосталы.

Праабражэнне Гасподняе здзейснілася неўзабаве да пакут і смерці на крыжы. Сын Божы з'явіўся на зямлю ў выглядзе чалавека, а тут траім вучням паказаўся ўззянні нябеснай славы, у якой прабывае спакон вякоў і ў якой пабачым Яго ў час паўторнага прыходу.

Ісус Хрыстос неаднойчы згадваў апосталам, што дзеля збаўлення людзей мусіць пакутаваць, памерці і на трэці дзень уваскрэснуць. Апосталы, не ведаючы Божага плану збаўлення, не маглі пагадзіцца з думкай, што так можа стацца з іх Настаўнікам, якога сведкамі навучання і цудаў былі з самага пачатку. Ісус ведаў гэта і таму рашыў прыгатовіць іх на цяжкія хвіліны сваёй мукі.

Евангелле так згадвае пра падзею Праабражэння Гасподняга: „Ісус узяў Пятра, Іакава і Іаана, і адных іх завёў на высокую гару. І пераўтварыўся перад імі: аблічча Яго ззяла як сонца, адзенне Яго пабялела як святло. І вось з'явіліся ім Майсей і Ілья, гутарачы з Ім" (Матф., 17:1-3). Збавіцель пераўтварыўся, значыць — паказаўся апосталам у іншым відзе чым дагэтуль. Неўзабаве светлае воблака асяніла іх і голас з воблака сказаў: „Гэта Сын Мой дарагі, у Якім Мая добрая воля, Яго і слухайце". Апосталы перапалохаліся, упалі, але Ісус дакрануўся да іх і сказаў: „Устаньце і не бойцеся". Яны глянулі навокал, але апрача Ісуса нікога ўжо больш не ўбачылі.

Штогод у свята Праабражэння Гасподняга, якое праваслаўныя адзначаюць паводле старога стылю, ноччу, пасля завяршэння першай літургіі, на гару Фавор „сходзіць" воблака. Гэтая з'ява здзіўляе, асабліва таму, што летам у кліматычных умовах Святой Зямлі дажджы не падаюць, аблокаў няма, неба заўсёды чыстае. Гэта сведчыць пра сапраўднасць адзіна праваслаўнай веры яшчэ і таму, што воблака з'яўляецца толькі ў свята паводле старога стылю, ніколі новага! Гэта цуд, які паказвае, што жыццё Царквы Хрыстовай з'яўляецца прадаўжэннем евангельскай гісторыі — светласці Славы Божай — прадаўжэннем прысутнасці Бога ў свеце. Каб у жыцці сваім адчуваць Ягоную дапамогу і ласку, Ягоную выратавальную моц, дастаткова ажыццяўляць Яго словы: „Сына Майго слухайце". Хрыстос, які ў славе паказаўся апосталам, прысутнічае і сярод нас у час Святое Літургіі, заклікае ўсіх да паправы жыцця, да зблізкэння з ласкавым нам Богам.

Пра падзеі на гары Фавор расказвае трапар: „Праабразіўся Ты на гары, Хрысце Божа, паказаўшы вучням Тваім славу Тваю, наколькі было ім магчыма. Няхай і нам, грэшным, заззяе святло Тваё вечнае, па малітвах Багародзіцы. Святладаўца, слава Табе". Усе мы паклікаdebug дзеля таго, каб „думаць аб тым, што ўгары" (Кал., 3:2), пра светласць вечную, пра „верхняе, дзе Хрыстос сядзіць з правага боку Бога" (Кал., 3:1).

„Хто будзе жыць у доме Тваім, хто будзе на святой гары Тваёй?" (Пс., 14:1). У праваслаўі адказ на гэтае пытанне дае духовы вопыт — царкоўны пост, адрачэнне ад заган і дрэнных звычак, чысціня цела і душы ды няспынная малітва выносяць чалавека да светласці Божай.

**Міхал Мінцэвіч**

## *Вяртанне з забыцця*

Слонімскі журналіст, паэт і краязнавец Сяргей Чыгрын працягвае сваю карпатлівую працу па вяртанні ў грамадскую памяць забытых імён шчырых і таленавітых беларусаў. Нашым чытачам вядомы яго артыкулы пра беларускіх дзеячаў — выхадцаў з Беласточчыны, якія ад шэрагу гадоў друкуюцца на старонках „Нівы" ў рубрыцы „Родам з Беласточчыны". У 1999 годзе выдаў ён у Беластоку кнігу „Вяртанне да сваіх", у якой сабраў творчасць міжваенных дзеячаў — ураджэнцаў Сакольчыны, а два гады таму склаў зборнік публіцыстыкі Міколы Шкялёнка „Беларусь і суседзі", выдадзены Беларускім гістарычным таварыствам.

Вынікам працы апошніх гадоў з'яўляецца яго навейшы зборнік „Пакліканыя на родны парог. Гісторыка-краязнаўчыя артыкулы", які з'явіўся на кніжных паліцах пад канец чэрвеня. У ім аўтар змясціў пятнаццаць нарысаў пра тых, пра каго беларусам памятаць трэба, а пра якіх творчасць і дзейнасць доўгімі гадамі замоўчвалася. Аўтар у паасобных аповедах малюе вобраз дзейнасці сваіх герояў на гістарычнай, палітычнай, літаратурнай ці навуковй нівах, прыгадвае іх складаныя лёсы, напрыклад, вязня Нарыма Тодара Лебяды, Кандрата Лейкі, які жыццё правёў на Украіне, ці Яна Пятроўскага, які апынуўся на эміграцыі ў ЗША.

У зборніку знаходзім таксама беластоцкія сляды. У артыкуле „Халімон з-пад пушчы" аўтар піша пра Яўгена Хлябцэвіча, сына святара з Кленік, карэспандэнта „Нашай нівы", крытыка і бібліятэказнаўцу, успамінае таксама Марыю Базылюк — даследчыцу ягонай творчасці, публіцыстыцы і літаратурнай крытыцы якога прысвяціла сваю магістэрскую працу. Нарыс „Незабыўны Янка Генюш" прысвечаны ўраджэнцу Крынак, мужу Ларысы Генюш і бацьку Юркі Генюша, доктару, бібліяфілу і палітыку. А ў артыкуле „Тры постаці: Станіслаў Грынкевіч, Франук Грышкевіч, Уладзіслаў Казлоўшчык" аўтар набліжае чытачу жыццёвы шлях і творчыя здабыткі ўраджэнцаў Сакольшчыны.

Аўтар, прыгадваючы забытых, малавядомых, але таленавітых і шчырых беларусаў, адзначае, што „сёння прыйшоў час паклікаць іх у Беларусь". Але вяртанне іх у грамадскую памяць у сённяшняй Беларусі справа нялёгкая, аб чым пераканаўся сам аўтар.

Хаця ў Беларусі цэнзуры быццам няма, але кіраўнікі друкарні выдатна выконваюць яе абавязкі. Калі кніга была здадзена ў Слонімскую друкарню і праз дзень-два павінны былі з'явіцца сігнальныя экземпляры, намесніца дырэктара заявіла аўтару, што ў кнізе „шмат недакладнасцей". Паводле яе нельга пісаць „кастрычніцкі пераварот у Расеі 1917 году", а толькі „Вялікая кастрычніцкая рэвалюцыя", не варта таксама ўспамінаць Беларускі народны фронт і т.п. Друкарня адмовілася выдаць кніжку і параіла аўтару прасіць дазволу ў Слонімскім райвыканкаме. Давялося шукаць іншую друкарню. Таму кніжка выйшла ў Мінску ў выдавецтве „Беларускі кнігазбор".

**Віталь Луба**

# Яна была маёй апорай

*Спадарыня Аляксандра прыняла мяне быццам родная маці. Не толькі накарміла, але яшчэ супольна са сваім мужам Сцяпанам запрапанавала мне ў сябе начлег! — успамін пра А. Бергман...*



**Так неяк дзіўна складваецца, што ў апошні час прыходзіцца мне пісаць амаль адны некралогі ды ўспаміны. Вось, заглянуў я ў пятніцу (8 ліпеня г.г.) у інтэрнэтавае выданне „Нівы" і ізноў сумная вестка: адышла ад нас славутая Аляксандра Бергман! А 15 ліпеня г.г. у мясцовасці, дзе я нарадзіўся, значыць, у Боцьках, прыснілася мне вялікая сінагога. Здавалася б, што і да чаго? І я зразумеў, што гэта, мабыць, адышоўшая ад нас спадарыня Аляксандра хоча, каб я адазваўся аб Ёй добрым словам.**

Пра Аляксандру Бергман пачуў я ў 1981 г. Будучы тады ў войску ў Вроцлаве, я наведаў навуковага працаўніка мясцовай Эканамічнай акадэміі, пакойнага ўжо (вечная яму памяць!) дац. Аляксандра Лукашука, родам з нашага Падляшша. Якраз дац. д-р Аляксандр Лукашук пазычыў мне тады яе незабыўную кніжку „Rzecz o Bronisławie Taraszkiewiczu", якую я прачытаў адным дыхам і якой захапіўся. Дагэтуль я не ведаў, што ў гісторыі беларускага рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху былі такія беларускія нацыянальныя дзеячы як Браніслаў Тарашкевіч! А вядома ж, што не толькі ён адзін. Гэта выклікала ў маёй свядомасці амаль шок! Дык, калі ў 1982 г. праследаваны тады камуністамі Сакрат Яновіч даў мне адрас спадарыні Аляксандры, я з вялікай прыемнасцю Яе наведаў. Мне вельмі цікава было асабіста пазнаёміцца са славутым аўтарам манаграфіі пра Браніслава Тарашкевіча. Як здаецца, едучы тады ў Кракаў, ад імя Беларускага незалежнага выдавецтва прывёз я ў той час Ёй увесь пачак „Беларускіх дакумэнтаў".

Спадарыня Аляксандра прыняла мяне быццам родная маці. Не толькі накарміла, змог я ў Яе выкупацца, але яшчэ супольна са сваім мужам Сцяпанам запрапанавала мне ў сябе начлег! А трэба тут яшчэ раз прыпомніць, што бачыў я Яе ў той час упершыню ў жыцці! У гэтых адносінах нагадвала яна мне сапраўдную яўрэйку-беларуску!

У 1989 г. мой сябра з Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў Мінску, дац. Язэп Янушкевіч, перадаў спадарыні Аляксандры частку „Іліяды" Гамера ў перакладзе Браніслава Тарашкевіча, якую я тады Ёй перадаў. Як вядома, гэты пераклад спадарыня Аляксандра ўвесь час шукала і таму была шчаслівай, калі я прывёз Ёй знойдзены ягоны фрагмент.

Быў гэта тады для мяне час вельмі трывожны. У 1988 г. я закончыў у Інстытуце сусветнай літаратуры імя Максіма Горкага АН СССР пісаць сваю вялікую навуковую працу пра беларускі перыядычны друк у былой Заходняй Беларусі, які пасля стаў асновай маёй доктарскай дысертацыі. Пад канец 1988 г. я вярнуўся з Інстытута сусветнай літаратуры імя Максіма Горкага АН СССР, што ў Маскве, у якім працаваў увесь год, у Варшаву. І якраз у той час з'явіўся ў мяне Тамаш Шчапаньскі-Леанюк з арганізацыі „Памост". Не ведаю, адкуль узяў ён мой адрас і тэлефон. Угаворваў ён мяне, каб я прачытаў лекцыю пра заходнебеларускі друк на незалежным сходзе гэтай арганізацыі ў Варшаўскім універсітэце. Неяк не спадабаўся мне ягоны заядлы антыкамунізм і я выкруціўся. Ад гэтага часу не прайшло і некалькі месяцаў, калі пра мяне ў Польскай акадэміі навук, у якой я тады працаваў, пачалі разыходзіцца чуткі, што быццам бы я чытаю лекцыі ў Варшаўскім універсітэце. Пра тое ўпершыню я даведаўся ад д-р Марыі Хаенцкай: „Ty tam dajesz jakieś wykłady na Uniwersytecie Warszawskim". Я спытаў яе: „Якія лекцыі?"

Бо ж ніякіх я ў той час не чытаў. „А ў Варшаўскім універсітэце", — адказала яна. Я атарапеў! На пачатку жніўня 1989 г. мгр Люба Сьвічэнюк-Фогель перасцерагла мяне і сказала, што нейкія чуткі кружаць пра мяне ўжо ад двух-трох месяцаў.

Яшчэ 23 чэрвеня 1989 г. праф. Васіль Белаказовіч у тэлефоннай размове са мною сказаў, што быццам бы: „Sława i chwała o Tobie rozchodzi się po całym Związku Radzieckim". А ўжо 28 чэрвеня 1989 г. ад адной з навуковых супрацоўніц, якая ўзяла мяне тады ў вострую абарону, я пачуў, што быццам бы я, як мела сказаць адна прафесар, „za polskie pieniądze uprawiam ideologię białoruską"! Чутка пра тое быццам дайшла да яе з Варшаўскага універсітэта! Сустрэлася гэта з вострай рэакцыяй гэтай доктар, якая потым, пасля вядомых падзей у Інстытуце ў 1991-1992 гг., даўжэйшы час працавала намеснікам дэкана ў адной з прыватных вышэйшых навучальных установ і з якой я дагэтуль у сяброўскіх адносінах.




*Аўтограф Аляксандры Бергман Юрыю Трачуку, падараваны 30.VI.1989 г.*

І вось, 2 жніўня 1989 г. нечакана ў свой кабінет паклікала мяне адна вядомая ў той час у гэтым Інстытуце прафесар. Пачалася раптоўная на мяне атака. Адзін вядомы перакладчык-украініст без ніякіх хітрыкаў сказаў: „Zwolnić go!" Не ведаў я ў чым справа і што здарылася, але пасля ўсіх гэтых фактаў і чутак, якія, так ці інакш, да мяне даходзілі, я пачаў спалучаць паасобныя факты ў нейкую цэласную карціну. І зразумеў, што іх крыніцай з'яўляецца непрачытанная мною „лекцыя" ў Варшаўскім універсітэце. Толькі 26 студзеня 1991 г., перад пазнейшымі ўжо падзеямі ў Інстытуце, я даведаўся, што быццам бы згаданая прафесар атрымала загад звольніць мяне з працы за „антыпольскія лекцыі", якія быццам бы я чытаў у „нацыяналістычным беларускім духу" ў Варшаўскім універсітэце! Гэтакім правакацыйным чынам распраўляліся тады з паасобнымі вучонымі, якія што-колечы рабілі ў той час у навуцы!

Аб усім гэтым я неадкладна расказаў светлай памяці спадарыні Аляксандры, з якой я быў у сяброўскіх адносінах і якая паспяхова ўмяшалася ў справу. Пасля гэтага ўсё прыціхла быццам бы камень у ваду і я зразумеў, што спадарыня Аляксандра з'яўляецца маёй сапраўднай сяброўкай.

У канцы 1991 г. я ізноў сустрэўся са спадарыняй Аляксандрай. І гэта была, мабыць, мая апошняя з Ёю сустрэча. Спадарыня Аляксандра запрапанавала тадышняй маёй жонцы напісаць у „Палітыку" артыкул пра Максіма Багдановіча ў сувязі з круглай, сотай гадавінай з дня яго нараджэння. Але тая, як гэта жанчына, неяк абыякава паставілася да гэтай прапановы. Спадарыня Аляксандра пазычыла мне тады адну з кніжак і ксеракопіі некаторых матэрыялаў. Расказваць Ёй, 85-гадовай у той час бабульцы, што здарылася ў Інстытуце славяназнаўства Польскай акадэміі навук 13 лютага 1991 г. і пасля гэтага не было ўжо сэнсу.

У 2001 г. у сувязі з 95 гадавінай з дня нараджэння спадарыні Аляксандры Бергман, якая выпала 1 мая, я выслаў Ёй юбілейныя віншаванні, назваўшы Яе ў іх гераіняй былой Заходняй Беларусі.

Адышла ад нас вялікая вучоная і дзяячка міжнароднага рэвалюцыйнага руху, змагарка за беларускую нацыянальную справу і грамадскую справядлівасць, якой і дагэтуль усё яшчэ няма ў нашым грамадстве. Думаю, што беларуская грамадскасць Гродна павінна неўзабаве грамадскім чынам паставіць Ёй, у гэтым родным для Яе горадзе, помнік, так як і Браніславу Тарашкевічу ў ягоных родных Мацюлішках, што цяпер у Літве. А калі не, дык асабіста сам беларускі прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка супольна з літоўскім — Валдасам Адамкусам.

Вечная Ёй памяць!

**д-р Юрый Трачук**




# http://belcentrum.org

Неяк ужо гістарычна склалася, што Чэхія для Беларусі і беларусаў з'яўляецца нечым альтэрнатыўным. Яшчэ з часоў сярэднявечча ехалі ў гэтую краіну дзеці яснавяльможных нашых продкаў здабываць веды ў Карлавым універсітэце. Мінулае стагоддзе таксама для многіх выхадцаў з Беларусі зрабіла Чэхію другім домам і месцам руплівай працы на карысць Бацькаўшчыны. Гэта, у першую чаргу, тычыцца дзеячаў Рады БНР. Цяпер менавіта з Прагі можна пачуць вольнае беларускае слова на хвалях радыё „Свабода".

Сёння ў Чэхіі ёсць іншыя арганізацыі, якім неабыякавыя людзі і сітуацыя ў Беларусі. Адна з іх — Беларускі цэнтар Супольнасьці „Чалавек у нядолі". Каб пазнаёміцца з ім, варта зазірнуць на сайт, што месціцца па адрасе: http://belcentrum.org.

На маніторы камп'ютэра з'яўляецца даволі нетыповае выяўленне вэбстаронкі. На сінім фоне экрана пасярэдзіне месціцца карычнева-шэрая частка карцінкі, дзе можна знайсці ўсе рубрыкі і навіны, датычныя Цэнтра ці беларуска-чэшскіх узаемаадносін. У левым верхнім вугле — выява Пагоні. Праўда, на гэтай старонцы ўсё напісана па-чэшску. Але калі мы клікнем на маленькі бел-чырвона-белы гузік, то перад намі адкрыецца беларускамоўная версія.

Усе навіны на першай старонцы падаюцца ў скароце і, каб прачытаць падрабязнасці, варта клікнуць на назву паведмлення.

Справа ад герба месцяцца выйсці да рубрык сайта. Іх не вельмі многа — усяго восем, але яны даволі поўна перадаюць інфармацыю, што тычыцца данага Цэнтра.

„Чэская Рэспубліка" — гэта першая старонка з навінамі.

„Пра нас" распавядае непасрэдна пра Центр і яго дзеянні. „Беларускі цэнтар Супольнасьці «Чалавек у нядолі» пры Чэшскай тэлевізіі быў заснаваны ў сакавіку 1998 году. Яго галоўнай мэтаю зьяўляецца падтрымка разьвіцьця незалежных дэмакратычных ініцыятываў і медыяў на Беларусі. Цэнтар таксама імкнецца прадстаўляць аб'ектыўныя інфармацыі пра падзеі ў гэтай краіне ды манітараваць парушэньне правоў чалавека тамтэйшым рэжымам. Беларускі цэнтар падтрымлівае й беларускія культурныя ды адукацыйныя памкненьні, якія не зьяўляюцца часткаю афіцыйнай рэжымнай структуры", — тлумачаць стваральнікі сайта. Тут падаюцца тэлефоны Цэнтра і паштовы адрас.

Старонка „Пра Беларусь" мае некалькі падрубрык. Сярод іх кароценькі чэшска-беларуска-англійскі слоўнік, выйсці да тэкстаў розных артыкулаў і кніг. Вельмі цікавая інфармацыя ў падрубрыцы „Беларусы ў Чэхах", дзе прапануецца невялікі экскурс у гісторыю беларуска-чэшскіх дачыненняў.

Аб працы Цэнтра можна даведацца на старонцы „Дзеі". Архіў яе змяшчае расповеды пра дзейнасць арганізацыі, пачынаючы з года заснавання.

„Галерэя" не толькі расказвае пра розныя мерапрыемствы, звязаныя з Цэнтрам ці з беларусамі ў Чэхіі альбо з чэхамі ў Беларусі, але таксама дае магчымасць пабачыць датычныя да гэтых падзей фотаздымкі.

Рубрыка „Супрацоўніцтва", адна з найменшых, але ўтрымлівае карысную інфармацыю для тых, хто прагне наладзіць кантакт з няўрадавымі арганізацыямі, мясцовымі самакіраваннямі, студэнтамі, навукоўцамі, мастакамі ды іншымі зацікаўленымі як з Беларусі, так і з Чэшскае Рэспублікі. Менавіта дапамога ў гэтым — адна з функцый Цэнтра.

**Уладзімір Лапцэвіч**

*Спабор кідальнікаў молата ператварыўся ў малы чэмпіянат Беларусі. Роўных нашым Івану Ціхану і Вадзіму Дзевятоўскаму ў сектары не было...*

# Беларусь, беларусы...

**Волаты молата і „белыя маланкі"**

Выдатна выступілі на чэмпіянаце свету па лёгкай атлетыцы, што больш тыдня доўжыўся ў сталіцы Фінляндыі, беларускія спартоўцы. У агульным медалёвым заліку (па вартасці заваяваных узнагарод) нашы сталі пятымі. Усяго ў Хельсінкі беларусы здабылі 5 прызавых месцаў — два першыя, два другія і адно трэцяе. Але не гэта галоўнае. Прыкладам, на чэмпіянатах свету ў Гётэборгу (1995 г.) і Парыжы (2003) Беларусь мела па 7 медалёў. Ды хіба ніколі не было такіх яркіх выступаў у асобных відах.

Асноўныя поспехі выпалі, як і чакалася, на нашы „традыцыйныя" віды. Надзея Астапчук, якая была лідэрам сезону ў свеце, не пакінула суперніцам нават прывідных шанцаў. Тыя змагаліся паміж сабой, а брэстчанка, якая была сярэбранай прызёркай папярэдняга першынства планеты, проста „афармляла" сваё золата. Спабор кідальнікаў молата ператварыўся ў малы чэмпіянат Беларусі. Роўных нашым Івану Ціхану і Вадзіму Дзевятоўскаму ў сектары не было. Дастаткова сказаць, што бронзавы прызёр паляк Шымон Зюлкоўскі адстаў ад стаўшага ўрэшце другім Дзевятоўскага, больш чым на тры метры (!). А двухразовым чэмпіёнам планеты стаў гродзенец Ціхан, які „па дарозе" ўсталяваў новы рэкорд першынстваў свету. Варта парадавацца і за наваполацкага кідальніка — Дзевятоўскага, які перажыў колькі год таму дыскваліфікацыю пасля сіднейскай алімпіяды. На афінскіх гульнях Вадзім, які не вызначаецца асабліва магутным целаскладам, стаў чацвёртым, а зараз „намалаціў" срэбра.

Парадавала Маргарыта Турава ў спартовай хадзе на 20 км. Маючы трэці рэйтынг у сезоне, Рыта выявіла валявыя якасці і з новым рэкордам краіны ўзышла на другую прыступку п'едэстала. А сама вострыя ўражанні засталіся ад выступу квартэту беларускіх спрынтэрак. На дыстанцыі 4 па 100 метраў нашы не толькі выйшлі ў фінал, але і дасягнулі бронзы. Юлія Несцярэнка, Наталля Салагуб, Алена Неўмяржыцкая і Аксана Драгун праляцелі фінальны забег бліскавіцамі. Беларускі саступілі толькі чарнаскурым дзяўчатам з ЗША і Ямайкі. Такім чынам нашы „белыя маланкі" хутчэйшыя ў Еўропе! Вяртанне Несцярэнкі на сур'ёзны ровень, нягледзячы на скепсіс многіх, трэба прызнаць удалым. Па-першае, яна — адзіная з белых спрынтэрак — прабілася ў фінал стометроўкі (у выніку 8-е месца). Па-другое, спрычынілася да эстафетнага поспеху. Варта адзначыць плённасць брэсцкай лёгкаатлетычнай школы — акрамя гомельскай прадстаўніцы Неўмяржыцкай, астатнія прызёркі выхаваны менавіта на захадзе краіны.

Вышэй галавы скокнула, а дакладней прабегла, стаерка Вольга Краўцова. Выніковае 10-е месца ў кампаніі кеніек і эфіёпак на дыстанцыі 5 км — выдатнае дасягненне ўраджэнкі Мастоў. Прытым Вольга чарговы раз у сезоне абнавіла нацыянальны рэкорд. Імкліва прагрэсуе таксама Ілона Усовіч — яна стала 9-й у бегу на 400 м. У сваю сённяшнюю сілу выступілі штурхальнік ядра Андрэй Міхневіч (6-ы), Алена Гінько ў хадзе (13-я), Наталля Сафроннікава ў трайным скачку (13-я). А найбольшае расчараванне — кідальніца молата Вольга Цандар. Гродзенка, якая сёлета мела другі вынік у свеце, на хельсінскім стадыёне не змагла нават трапіць у фінал.

У выніковым заліку Беларусь змагла апярэдзіць усіх суседзяў, акрамя Расіі. А галоўнае — маем даволі маладую каманду, якая можа „расці".

**Уладзімір Хільмановіч**

# *Золата партыі*

*— Цікава, як знайсці правільны падыход да нашага выбаршчыка, — задумліва ўздыхнуў Лявон пасля лекцыі па выбарчых тэхналогіях, якая адбывалася ў Літве, і на якой амерыканцы вучылі беларусаў як можна граматна перамагчы на выбарах у Англіі. — Што цікавіць беларускага выбаршчыка, хіба не ведае ані ён сам, ані ніхто на свеце. Мне здаецца, што наш чалавек кіруецца толькі эмоцыямі, — працягваў разважаць Лявон. — І верыць абычаму. Тэлевізару давярае. А там нас зняслаўляюць, як п'яныя матросы ўчарашнюю каханку. Кажуць, што мы на замежныя грошы існуем. А людзі слухаюць, і думаюць што праўда. Так мы ніколі іх сімпатый не здабудзем.*

*— Можа яно і так, — сумна ўздыхнуў Віктар. — Але якія бываюць цікавыя гісторыі, звязаныя з сімпатыямі нашых выбаршчыкаў. І з тым, як яны рэагуюць на замежныя сродкі. Давай раскажу табе адну.*

*Прайграў я неяк выбары ў мясцовы савет. Прайграў — слова не тое. Сам ведаеш якія ў нас выбары і які выбар. Як у барана на бойні. Выйграе заўсёды той, хто мае права лічыць галасы. Чаго толькі мы туды сунемся, у тыя выбарчыя кампаніі? Пішчом лезем, як каровы ў бульбоўнік. Хоць ведаем, што ўсё ўжо палічана. Нас яшчэ цяжэй зразумець, чым тых выбаршчыкаў.*

*Ну, але бліжэй да тэмы. Заўважыў я пасля тых прайграных выбараў, што знаёмыя і суседзі, якія напачатку нібыта адносіліся да маёй дзейнасці з павагай, нават дапамагалі на выбарах, пасля майго пройгрышу сталі ставіцца да мяне несур'ёзна. Нават некаторыя падсмейваліся. Што, маўляў, апазіцыянерчыкі. Ні чарта вы зрабіць не можаце, і нічога нявартыя. І няздольныя ні на што.*

*Мяне гэта вельмі турбавала. Бо менавіта на гэтых людзей увесь разлік. І тлумачыў я ім, і даводзіў розныя думкі — усё марна. Як гарохам аб сцяну. Хоць ім кол на галаве чашы. Не даходзіць. Ніхто і слухаць не хоча. Лепш купяць бімбар у краме, заліюць мазгі, і толькі тады цябе прызнаюць, калі ты з імі разам цяпнеш шклянку-другую. І то не цябе слухаюць, а стараюцца табе давесці, што ні халеры зрабіць немажліва, і на халеру табе гэта патрэбна.*

*А апазіцыя зноў да выбараў пачала рыхтавацца. Зноў навучальныя семінары пайшлі. Дай, думаю, і я з'езджу на які. Можа што новае пачую, як зноў давер у людзей набыць. Семінар тады ладзілі ў Варшаве. Нічога новага я не пачуў, і нічога забароненага з сабой не вёз. Але ўлада меркавала інакш. Зартымалі мяне з яшчэ адным знаёмым на мяжы, і паперы нейкія пад нос суну́ць. Маўляў, усе ад каго гэта залежыць, далі згоду, каб нас абшукаць, і ўсё што хочуць забраць.*

*Спрачацца мы не сталі. Тым больш што кішэні пустыя. Усё ў галаве перавозім. А на мытні ў нас усё чагосьці шукалі ў вопратцы. Што там магло быць? Я ажно падумаў, што ўлада лічыць нас яшчэ дурнейшымі, чым тыя, хто ніяк не можа зразумець, чаго людзі сунуцца ў палітыку.*

*Колькі нас не трымай, а адпускаць усё адно трэба. Проста непрыемна на душы было. Вярнуўся, называецца, на Радзіму. А Радзіма сустрэла раскрытымі кайданкамі. Ды і знаёмыя, мяркую я сам сабе, яшчэ больш смяяцца будуць. Зноў скажуць, што мы слабыя, як здохлы кот, і з намі могуць зрабіць што заўгодна. Ды яшчэ чуткі распусцяць якія, што замежныя грошы перавозіў. Бо так казалі тыя, хто абшукваў.*

*Але найбольш я быў уражаны назаўтра. Мае знаёмыя і суседзі глядзелі на мяне з нейкай таямнічай павагай, як падлеткі на майстра каратэ, кунфу і бокса разам. Нейкія газеты перадавалі адзін другому, да мяне падыходзілі, і таямніча-даверлівым прыцішаным голасам казалі, што калі мне будзе патрэбная нейкая дапамога, то магу да іх звяртацца. Яны не толькі могуць дапамагчы, але і хочуць гэта зрабіць, і настойваюць на гэтым.*

*Майму здзіўленню не было межаў. Я таксама купіў газету і ўбачыў артыкул, які саркастычна-жартаўліва апавядаў, здзекуючыся з уладаў, што ў мяне на мяжы шукалі золата партыі. Зразумела, што партыя апазіцыйная, а золата замежнае. Такое прыгожае, у зялёных паперках з партрэтамі амерыканскіх прэзідэнтаў. І вельмі шмат таго золата. Я сеў на лаўку і доўга смяяўся. Во, калі зноў павага да мяне вярнулася. Не тады, калі я, страціўшы працу, усё адно змагаўся за свае ідэалы, не тады, калі мяне затрымвалі, арыштоўвалі, судзілі, а я стаяў на сваім. А тады, калі знаёмыя і суседзі паверылі ў тую лухту, што мы з-за мяжы можам браць столькі сродкаў, колькі хочам. І цяпер, калі хтось падыходзіць і пытаецца, так напачатку трохі недаверліва, ці праўду казалі па тэлевізіі, што нам амерыканцы сорак мільёнаў долараў далі, я заўсёды адказваю так:*

*— Праўда. Але гэта толькі афіцыйна. Неафіцыйна мы чакаем значна больш.*

*І, ведаеш, яшчэ нікога я не сустрэў, хто гэтае паведамленне ўспрыняў бы адмоўна. Наадварот. Успрымаюць неяк, я б сказаў, з павагай і шкадаваннем, што яны раней не ўступілі ў апазіцыйныя партыі.*

***Генрых Злпадашмянскі***

# Цар прыцягвае гасцей

**Белавежская пушча, якая стагоддзямі была месцам паляванняў польскіх каралёў, пасля падзелаў Рэчы Паспалітай апынулася пад уладаннем расійскіх цароў, таксама заўзятых аматараў паляванняў. У 1894 годзе ў Белавежы быў узведзены царскі палац, а вакол яго — парк, пабудавалі царкву і памяшканні для службы. У 1897 годзе ў Белавежу была пракладзена чыгунка і пабудаваны вакзалы.**

Пасля звыш ста гадоў чыгуначнае спалучэнне з Белавежай (бывала, па сем паяздоў у суткі) было ліквідавана, а салідны будынак вакзала Белавежа-Таварная з году ў год руйнаваўся. Ад далейшага занападу выратавала вакзал прыватная ініцыятыва двух асоб і цяпер, з 16 лютага г.г., месціцца там фешэнебельны „Царскі рэстаран”. На галоўнай сцяне адной з зал зноў павіс партрэт цара Мікалая II.

***— Што прывяло чалавека з цэнтра краіны ў Белавежу?*** *— пытаю Міхала Грынкоўскага, саўладальніка рэстарана.*

— Усё пачалося два гады таму па ініцыятыве майго сябра і саўдзельніка. Прыехаў я ў Белавежу на „Ноч Купалы”, і ён прывёў мяне ў гэтае прывабнае месца, паказаў. Гэтае месца захапіла мяне з першага позірку. Рашылі мы — пасля доўгіх размоў — супольна купіць і адрамантаваць гэты будынак. Першай нашай думкай была ўстаноўка там рэстарана.

***— Як вам у так кароткі час удалося абсталяваць рэстаран у стылі мінулай эпохі?***

— Усе вокны і вонкавыя дзверы новыя, але яны даўняга ўзору. Нам пашанцавала, бо ў Белавежы знайшлі мы цесляроў і сталяроў, якія з вялікім заангажаваннем дапамаглі нашай задуме. Гмінныя ўлады паставіліся да нас вельмі прыхільна, але падтрымкі не далі, бо нават водаправод праклалі мы за свой кошт. Абсталяванне інтэр’ера (тры залы па 60-70 месц) і агарода падабралі мы самі, не прыцягаючы для гэтага спецыялістаў. Інтэр’ер аснашчаны эклектычнай мэбляй з эпохі паўстання гэтага будынка. У 85% гэта арыгінальная мэбля, купленая на распродажы старызны, частка з сямейнай калекцыі выкананай маім дзедам, а частку мы заказалі ў якасці копіі старых узораў. Рамонт доўжыўся каля года, а адкрыццё новага аб’екта адбылося 16 лютага г.г.

***— Якое зацікаўленне вашым рэстаранам, якія трапляюць сюды госці і як успрымаюць вашу задуму?***

— Госці з Беларусі трапляюць да нас рэдка. Бывалі расійскія консулы і вельмі хвалілі нас, што мы ўсё карэнна аднавілі. Назва „Царскі рэстаран” з’яўляецца не толькі маркетынгавым прыёмам — яна мае свае падставы. Бывае, што людзі, якія ўваходзяць у рэстаран, пытаюць, ці гэта музей.


Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

*Вонкавы выгляд рэстарана*

Гасцяваў у рэстаране і маршалак Уладзімеж Цімашэвіч з нагоды адкрыцця пагранпераходу ў Белавежы. Ён прызнаўся, што пабываў у многіх паляўнічых залах, але наш рэстаран палічыў адным з найпрыгажэйшых.

***— Ці маршалак плаціў за абед?***

— Тады абед аплаціла Маршалкоўская ўправа.

***— Якая ў „Царскім рэстаране” кухня?***

— Прапануем расійскія і старапольскія стравы. Наша меню змяняецца лівае. Здараюцца стравы дня і стравы-сюрпрызы. Прымыкаем і да еўрапейскай кухні. Пастаянных гасцей, якіх усё большае, стараемся нечым засцігнуць. Спажывальнікі часта заказваюць юшку, салянку, пельмені і дзічыну.

***— Ці маеце начлежную базу? Планы?***

— Пакуль не маем, але думаем адрамантаваць былую вадакачку і абсталяваць там прынамсі два апартаменты. Зараз мы з’яўляемся ўласнікамі комплексу пасляваказальных будынкаў. Уласнасцю чыгункі з’яўляюцца толькі прылягаючыя пуці, па якіх, магчыма, яшчэ паедуць паязды.

Я на Падляшша прыехаў упершыню два гады таму, але мой супольнік Міхал Альшэўскі тут нарадзіўся і ўзгадоўваўся ў мясцовым Доме дзіцяці. Ён падкрэсліваў, што дзіцём ездзіў зайцам між Таварным і Палацавым вакзаламі, бо не меў за што купіць білетаў. А пасля гадоў стаў саўладальнікам гэтага вакзала.

***— Дзякую за размову.***

**Гутарыў Міхал Мінцэвіч**


Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

*За адной залай сочыць з партрэта цар Мікалай II*

## *Добрая школа і споведзь*

*Бывала, калі я заехаўшы са сваёй паштовай сумкай у Тафілаўцы сустракаў альбо дзядзьку Івана Галка, альбо іншага дзядзьку Івана — Тапора (трэцяга іх супольніка, дзядзьку — Тараса Жака — я не ведаў, бо ён ужо не жыў), дык міжвольна ўсміхаўся на ўспамін, як гэтыя дзядзькі дасталі калісьці, у міжваенны час, лупцаванне ад бацюшкі Мірана.*

*Мо не здзіўляў бы той успамін, калі б Іван Тапор у той час не наводзіў у Тафілаўцах жаху. Ён каму хацеў, таму даваў у скуру; яго баяліся як агню, а да таго ж меў ён немалую кампанію „зухаў”. Аднойчы на забаве ў сваёй вёсцы ён з каменем у руцэ прайшоўся каля чаргі выстраеных амаль на смірна хлопцаў і аднаго зладзеяватага Дэмка ўрэзаў тым каменем па галаве, аж кроў пайшла, і спытаў: „Хопіць, ці яшчэ дабавіць?”. Той адказаў: „Ой, не, хопіць і за гэтае дзякуй”.*

*Аднойчы, бышы ў ягонай хаце, я, усміхнуўшыся, запытаў яго:*

*— А як там было каля царквы з Міранам?*

*— Ты, відаць, ужо чуў, — адказаў ён, — як гэта было. А было так: мы, выпіўшы, пад вечар праходзілі каля царквы ў Дубічах і заспявалі брыдкаслоўную песню пра бацюшку (тут ён працытаваў мне яе, але я не буду прыводзіць гэтага непрыстойнага зместу). Ён акурат стаяў каля плота з дубінкай і звярнуў нам увагу, каб мы перасталі так спяваць, бо там святое месца ды час посту. Але мы яшчэ галасней загарланілі. І тады ён пачаў нас „хрысціць” дубінкай. Я дастаў тры разы па спіне так, што аж упаў на зямлю, Тарас дастаў мо з шасцаццаць разоў ды і Івана Галка не мінавала Міранавая палка. На другі дзень, збалелыя, пайшлі мы перапрашаць бацюшку і цэлы дзень вазілі гной на яго палетак.*

*Значыць, добрая была такая школа. Іншым разам бацюшка Міран ехаў з вазком фурманкаю ў Грабавец. Мінуў іх на роварах адзін п’яны, спыніўся і стаў лаяць Мірана. Бацюшка з воза накіраваўся да яго, ён стаў уцякаць, але ўехаў у пясок і ўпаў. Бацюшка яго так там „ахрысціў”, што ён больш ужо нікога не чапаў. Добрая школа нікому не шкодзіць.*

**Мікалай Панфілюк**

## *Рамонт Гайнаўкі*

Сёлета ў Гайнаўцы будуюць і аднаўляюць вуліцы. Хутка справіліся з пабудовай шырокай асфальтоўкі па вуліцы Бакавой, якая спалучае 3 Мая і Баторыя. Заканчваюць класці асфальт на бруку вул. Беластоцкай. Цяпер перабудоўваюць вул. Калясніка ды чатыры вулачкі ў раёне Юдзянкі. У маі г.г. улады Гайнаўкі намецілі перабудову вуліцы Электрычнай і спалучанай з ёю вул. Збажовай. Пачынаюць рамантаваць вул. Баторыя. Тут пабудуюць новую вадасцёкавую каналізацыю, калектар. На скрыжаванні вуліц Баторыя і Ліпавай будуць святлафоры. Кошт перабудовы складзе суму каля 4,5 млн. зл. **(мох)**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714
**Nakład**: 1 003 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Сакратар рэд.:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі”:** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп’ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2005 r. upływa 5 września 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

# „Даўціпы" Андрэя Гаўрылюка

Новак хваліцца сябру сваёй гадоўляй паштовых галубоў:

— Гэта маё найбольшае дасягненне: скрыжаваў голуба з гаваркім папугаем!

— Ці гэты птах перадаваў паведамленні ўголас?

— Гэтага ён яшчэ не асвоіў, але заўсёды, калі заблудзіць, можа распытаць пра дарогу.

* * *

Дырэктар прадпрыемства кліча кадравіка:

— Як вам вядома, я неўзабаве збіраюся на пенсію. Ці ведаеце каго, хто мог бы мяне наследаваць?

— Можа магістр Кавальскі з планіровачнага цэха?

— М-м-м... Той рацыяналізатар? Будзьце ветлівы звольніць яго з першага чысла з працы!

* * *

Кавальская ўсыпляе свайго маленькага сыночка:

— А калі ноччу будзеш нечага патрабаваць, тады пакліч голасна „Мама!" і татка зараз да цябе прыбяжыць.

* * *

Гутараць два бізнесмены-махляры:

— Як табе паводзіцца?

— Ужо пяты раз сёлета банкрутую.

— Ну і што?

— Калі так далей пойдзе, то за шостым разам абанкручуся зусім.

* * *

— Стась! Ці ты чуў, што ў час імшы ў касцёле зрабіў Янак?

— Не, нічога не чуў.

— Уяві сабе: касцельны збірае ахвяраванні, а Янак спіць ды голасна храпе. Касцельны патрос яго за плечы, а Янак на ўвесь голас крыкнуў: „Адчапіся! У мяне білет на цэлы месяц".

* * *

Адной ночы жонка ўбачыла свайго мужа пры калысцы іхняга немаўляці. Заўважыла, што ён глядзеў на спячае дзіця, а на яго твары мяняліся эмоцыі: недавер, раскоша, здзіўленне, захапленне, скептыцызм. Усхваляваная такою праяваю глыбокіх бацькоўскіх пачуццяў, падышла да яго, прытулілася і шапнула:

— Дам вялікія грошы за твае думкі!..

— Гэта страшна, — заявіў ён, — як такая калыска можа каштаваць толькі 29 злотаў і 90 грошаў!

* * *

Міліцыянер запыняе самаход ды пытае шафёра:

— Ці вы сёння пілі?

— А ці гэта абавязкова?

* * *

На пастарунку звоніць тэлефон; у трубцы разадаецца трывожны голас:

— Ратуйце, мая цешча хоча выскачыць праз акно!

— А што ж такое сталася? — дапытваецца дзяжурны. — Акно закліналася?..

* * *

— Што гэта такое савецкі струнны квартэт?

— Гэта сімфанічны аркестр, які вяртаецца з замежжа.

* * *

Пачынаючая спявачка да музычнага крытыка:

— Як вы думаеце: ці з маім голасам я б дасталася ў оперны тэатр?

— Калі купіце білет...




# АДЗНАЧЭНЬНЕ ЎГОДКАЎ АРШАНСКАЕ БІТВЫ

На беразе Дняпра блізу Воршы — адбудзецца сёлета 3 верасьня (пачатак каля 19.00)

**Да месца можна даехаць**

З чыгуначнага вакзала на аўтобусе № 11 да аўтавакзалу (канец маршрута). Далей — аўтобусам „Ворша — Дуброўна" да прыпынку „Гацькаўшчына".

Гуртам можна наняць маршрутку з чыгуначнага вакзала проста да Гацькаўшчыны.

Таксама аўтобусам альбо маршруткай можна ад'ехаць ад прыпынку прыгараднага транспарту на Цэнтральнай плошчы, які знаходзіцца ля ўнівермагу, за помнікам Леніну (да Цэнтральнай плошчы можна даехаць з чыгуначнага вакзала аўтобусам альбо маршрутным таксі № 1 да прыпынку „Цэнтр", адтуль прайсьці пехатою, спытаўшы накірунак да ўнівермагу).

Ад прыпынку „Гацькаўшчына" да месца каля 1 км.

**Спадарожныя цікавосткі**

Па два бакі Цэнтральнай плошчы знаходзяцца музэй Уладзіміра Караткевіча і Прыдняпроўскі парк з помнікам на месцы хаты, дзе прайшло ягонае дзяцінства.

У парафіяльным касьцёле Сьв. Язэпа захоўваецца копія вядомай карціны „Аршанская бітва", да касьцёла можна даехаць тым жа маршрутам №1 да прыпынку „Швейная фабрыка". Болей можна прачытаць у сеціве: http://radzima.org/pub/miesta.php?miesta_id1=viarvors

**Мапы**

http://orshacity.narod.ru/map/orshamap/index2.html

http://www.emaps-online.com/rus_win/maps/oblast/obl_vitebsk/regions/reg_orsha/cities/orsha/map.shtml

*Сяргей Панізьнік*

## Удажджаваны Вавель

*Над Польшчаю — дажджоў аблавы.*
*Прыпынак у сталіцы славы.*
*Скульптуры Вавеля... Выявы*
*не ачужэлыя і мне.*
*Тут сам Ягайла ў вечным сне —*
*у саркафагу, бы ў чаўне.*
*Калі б ішоў Францыск Скарына*
*залеўнай гэтаю парой, —*
*змакрэла б гордая чупрына,*
*не стаўбурылася б гарой...*

*Нібыта Ной, лічу я ў мораk*
*бажніцаў зыбкія кліны.*
*З іх землі нашыя відны?*
*З іх азываюцца мне хорам*
*і беларускія сыны.*
*Змакрэлі гордыя званы,*
*але варушацца й яны...*
*Так многа конных, многа пешых*
*тут угрэбавана людзей.*
*У ліхтарах бліскучы, свежы*
*каронны Вавель мые вежы...*
*І сам я ў кракаўскім начлежжы —*
*нібыта рыбіна ў вадзе.*

# Адгаданка




1. вопратка, 2. выхавацелька, выкладчыца, 3. слімак, 4. жыхар цэнтральнай Сібіры, 5. захапленне, любімы занятак у вольны час, 6. гандлёвае прадпрыемства рознічнага гандлю півам, 7. марлевая стужка для перавязкі ран, 8. на шыі, 9. горад Прыяма. **(ш)**

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — прыказка.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 28 нумара**

Трактар, кнігаўка, насціл, раман, бот, Белавежа, жаніх. Рашэнне: **Калі камарна, то і хлебна.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

# 21.08 – 27.08



**Баран (21.03. — 19.04.)** Скандалы, сваркі і вострыя счэпкі, асабліва з 24.08. у квадратуру Меркурыя і Марса. Партнёр папракне цябе ў фінансавай распусце. З 26.08. можаш расчаравацца ў кімсьці, каго ты лічыў сябрам. Гэта кране цябе да жывога.

**Бык (20.04. — 20.05.)** Да 22. 08. добры час на выказанне пачуццяў ці стопрацэнтна ўдалую здзелку. Работа гарыць у руках. Конскае здароўе.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Не выбірайся лепш у падарожжа, будзеш занадта рассеяны. Можаш заблудзіцца, трапіць ці нават быць прычынай нейкай аварыі. З 24.08. будзеш разгарачаны, сварлівы, можаш нагаварыць сабе бяды.

**Рак (22.06. — 22.07.)** Энергія Марса дадасць табе адвагі, дасць вытрымку і размах у дзеяннях. Усвядоміш сабе, чаго табе трэба і што варта рэалізаваць.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Разгарацца да белага твае прафесійныя амбіцыі. З сілай можаш пачаць узбірацца па прыступках кар'еры. У парах з доўгім стажам распаляцца нанава жарсці.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** З 24.08. будзеш расслаблены і рассеяны, асцерагайся важных вырашэнняў, бо цяжка будзе табе ацаніць правільна сітуацыю. З 24.08. небяспека ў падарожжы, асцерагайся бравурнасці і хуткай язды.

**Шалі (23.09. — 22.10.)** Да 22.08. шанцуе табе ў фінансах; гарантыя поспеху — пазітыўныя думкі. Выклічаш зайздрасць у адных, іншыя будуць у цябе вучыцца. Цярпліва чакай грошай. Маладыя Шалі могуць шмат зарабіць.

**Скарпіён (23.10. — 21.11.)** Варта быць дапытлівым і скрупулёзным — будуць вынікі. Зоркі выдатна спрыяюць прафесійным планам. Шмат дабрадзейнства ў міжчалавечых кантактах, вельмі ўдалыя падарожжы.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** З 26.08. можа ахапіць цябе благі настрой, знеахвочанне да ўсяго, можаш быць „непрысутны духам". Могуць выявіцца чорныя бакі твайго характару. Раман акажацца быць змрочным і прынясе боль і расчараванне. Будзь асцярожны за рулём.

**Казярог (22.12. — 19.01.)** Да 22.08. лагода і спакой. Знакаміта дагаворышся з людзьмі, наладзіш файныя кантакты, будзеш душой кампаніі. Спантаннасць і радасць. Трапныя прафесійныя рашэнні.

**Вадалей (20.01. — 18.02.)** Лёгка прыйдзецца закахацца і ачаравацца, але цяжка пагадзіцца са стратай свабоды. Не спяшайся з засноўваннем свае фірмы, ды можаш пачаць шукаць працу. Маеш гарантаваную падтрымку сяброў.

**Рыбы (19.02. — 19.03.)** З 26.08. можаш нервавацца і абы-што вывездзе цябе з раўнавагі. Можаш страціць веру ў сябе. Затое можаш прыпомніць сабе, што такое палымяны раман ці сапраўдная любоўная прыгода! Можаш паспяхова караскацца па прыступках кар'еры, сягаць па ўладу, але не мусіш чакаць, што ўсе цябе будуць любіць. Хтосьці знаёмы можа ўманеўраваць цябе ў нецікавую сітуацыю.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960